

У ПАДАРОЖЖА... УСЛЕД ЗА КАЦЯРЫНАЙ II



МАНІ-МАНІ ДЛЯ МАНІ

16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 САКАВІКА 2023 г.
СЕРАДА
№ 49 (29929)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Пётр МІКЛАШЭВІЧ, Старшыня Канстытуцыйнага Суда:**

*«Абноўленая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, з'яўляючыся вынікам грамадскай згоды, змяшчае мадэль палітычнага і сацыяльна-эканамічнага ўладкавання дзяржавы і грамадства, вызначае ўдакладненую стратэгію далейшага канстытуцыйна-прававога развіцця Беларусі ва ўмовах існуючых выклікаў сучаснасці, выступае асновай фарміравання эфектыўных канстытуцыйна-прававых механізмаў забеспячэння міру і нацыянальнай бяспекі, канстытуцыйных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, народаўладдзя, дзяржаўнага суверэнітэту».*

# НАДЗЕЙНАЯ АСНОВА НАШАГА АДЗІНСТВА

*Дарагія суайчыннікі!*

*Сёння мы адзначаем Дзень Канстытуцыі.*

*У Год міру і стваральнай працы гэтае свята набывае асаблівую значнасць.*

*Асноўны Закон краіны адлюстроўвае шматвяковае імкненне беларусаў самім вызначаць свой шлях развіцця, жыць у незалежнай дзяржаве, сваёй працай забяспечваць дабрабыт грамадства.*

*Абноўленая ў пераломны для краіны час Канстытуцыя захавала асноўныя прынцыпы міралюбнасці, сацыяльнай справядлівасці, павагі да дасягненняў мінулага, пераемнасць традыцыйных каштоўнасцяў беларускага народа, стала надзейнай асновай для ўмацавання грамадскага адзінства, сацыяльна-палітычнай стабільнасці, зладжанай і эфектыўнай работы ўсіх галін улады.*

*У сучасных геапалітычных умовах няўхільнае прытрымліванне палажэнняў Асноўнага Закона служыць надзейнай гарантыяй абароны нацыянальных інтарэсаў, умацавання прававога падмурка беларускай дзяржаўнасці, робіць нас яшчэ больш моцнымі і паспяховымі.*

*Віншую ўсіх грамадзян Беларусі з Днём Канстытуцыі!*

*Няхай наша родная краіна заўсёды будзе мірнай, шчаслівай і квітнеючай!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**




Фота БелТА.

## КОРАТКА

- Канстытуцыйны Суд прыняў пасланне Прэзідэнту і Нацыянальнаму сходу.
- **У Беларусі з пачатку сакавіка выпала ападкаў у 1,5—2,5 раза больш за норму.**
- Мінабароны паведамляе аб планавым прызыве ваеннаабавязаных на зборы ў сакавіку.
- **БДУ запрашае старшакласнікаў з усёй Беларусі ў школу юнага пісьменніка.**
- Мінпрыроды заклікае адмовіцца ад збору і куплі першацветаў.
- **МТЗ наладзіў серыйны выпуск трактароў з гумава-арміраванымі гусеніцамі.**
- Шырокая грашовая маса ў Беларусі за люты павялічылася на 3,2 працэнта.




# НЕАПРАЎДАНАЯ РЫЗЫКА

**Наводзячы парадак на зямлі, задумайцеся аб наступствах**

**Нягледзячы на тое, што дзе-нідзе яшчэ ляжыць снег, пачатак вясны — нагода пагаварыць пра навядзенне парадку. Нашы людзі такія: як толькі прыгрэе першае сонейка, распачынаюць генеральную прыборку на прысядзібных участках. На жаль, не заўсёды пры гэтым выконваюць элементарныя правілы бяспекі.**

Менавіта з наступленнем вясны пачынаецца пажаранебяспечны перыяд. Кожны год, наводзячы парадак каля хат, спальваюць смецце і мінулагоднюю траву, а ратавальнікі выязджаюць на сотні, а то і тысячы пажараў, звязаных з сезоннымі работамі на зямлі. Як паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, летась у краіне адбылося 7990 пажараў у прыродных экасістэмах, у выніку якіх загінулі 17 чалавек. З іх 7258 выпадкаў гарэння травы і кустоў адбылося на плошчы больш чым 1,82 тысячы гектараў. Асноўнымі прычынамі ўзгаранняў, як паведамляюць ратавальнікі, традыцыйна з'яўляюцца неасцярожнае абыходжанне з агнём падчас спальвання сухой раслліннасці.

СТАР. 3

На варце якасці

# УВАГА: НЕБЯСПЕЧНЫ ТАВАР

**Як супрацоўнікі Магілёўскай абласной інспекцыі Дзяржстандарту абараняюць інтарэсы спажыўца**

**Тэхрэгламенты і стандарты ва ўмовах спажывецкага рынку неабходны для таго, каб павысіць узровень бяспекі нашага жыцця і здароўя, захаваць уласную і грамадскую маёмасць, абараніць экалогію, жывёльны і раслінны свет. Імі гарантаваныя якасць прадукцыі (работ, паслуг), адзінства вымярэнняў, рацыянальнае выкарыстанне рэсурсаў і гэтак далей. Адных толькі тэхрэгламентаў Еўразійскага эканамічнага саюза на сёння існуе 53. І больш за 30 з іх кантралюецца Дзяржстандартам. Пра тое, як абараняюцца спажывецкія інтарэсы, — у размове з супрацоўнікамі Магілёўскай абласной інспекцыі гэтага ведамства.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

23049

9 771990 763008

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

**Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!**

**Ідзе падпіска на II квартал 2023 года**

**ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!**

З нагоды

# МЫ — ГРАМАДЗЯНЕ!

## Напярэдадні Дня Канстытуцыі юным беларусам па ўсёй краіне ўручылі пашпарты

**Урачыстыя цырымоніі перадачы першых пашпартоў юным грамадзянам нашай краіны адбыліся ў рамках Усебеларускай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!», якая стартавала 13 сакавіка, напярэдадні Дня Канстытуцыі. Свой галоўны дакумент, а разам з тым і пуцёўку ў дарослае жыццё, хлопчыкі і дзяўчынкі атрымалі з рук кіраўнікоў дзяржаўных органаў, ведамстваў, грамадскіх арганізацый. У падарунак юнакі і дзяўчаты па традыцыі атрымалі дзяржаўны сцяг і Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.**


Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА




**Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА,** які таксама ўзяў удзел у цырымоніі ўручэння пашпартоў, назваў гэтае мерапрыемства найважнейшай падзеяй для 14-гадовых хлопчыкаў і дзяўчынак. «Яны атрымліваюць самы істотны ў сваім жыцці дакумент — пашпарт, які ўвасабляе прыналежнасць да дзяржавы, — адзначыў ён. — Кожнае дзіця павінна адчуць, што ў яго ёсць не толькі правы, якімі яно павінна карыстацца, з'яўляючыся грамадзянінам нашай краіны, але і самае галоўнае — абавязкі, якія трэба ў поўнай меры, як гэта прадугледжана Канстытуцыяй і адпаведнымі законамі, рэалізоўваць і выконваць».

Упершыню патрыятычная акцыя «Мы — грамадзяне Беларусі!» адбылася ў 2004 годзе па ініцыятыве Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Толькі па лініі БРСМ сёлета адбудзецца каля 150 урачыстых уручэнняў з удзелам больш як трох тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак. «Гэтага гонару ўдастойваецца самая лепшая частка нашай моладзі: тыя, хто добра вучыцца, актывісты, спартсмены, пераможцы алімпіяд, а таксама хлопцы і дзяўчаты, якія з'яўляюцца членамі БРСМ — яны заўсёды займаюць актыўную жыццёвую пазіцыю ва ўсіх сферах і задаюць тон нашай моладзі, — заўважыў віцэ-прэм'ер. — Спадзяюся, гэтая добрая традыцыя будзе працягвацца і надалей. Думаю, гэта падзея напярэдадні Дня Канстытуцыі назаўсёды застанецца ў памяці дзяцей».

**Паводле БелТА.**

Класныя навіны

# Навучыць супастаўляць і думаць

**У наступным навучальным годзе колькасць вучэбных гадзін па рускай і беларускай літаратуры ў 10—11 класах школ павялічыцца. Пра гэта на выніковай калегіі камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама праінфармаваў педагагічную грамадскасць міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ.**

Ён нагадаў, што ў бягучым навучальным годзе павялічыўся на паўгадзіны ў тыдзень час, прадугледжаны на выкладанне беларускай і рускай моў. А з наступнага года ў старшакласнікаў стане больш беларускай і рускай літаратуры. Колькасць гадзін па гэтых прадметах таксама плануюць павялічыць на 30 хвілін у тыдзень.

Міністр звярнуў увагу на некаторыя ключавыя моманты, якія датычацца правядзення выніковай атэстацыі.

— Што датычыцца дзевяцікласнікаў, тут у нас адбыліся змяненні ў форме правядзення экзамену па рускай і беларускай мовах. Мы перайшлі ад дыктанта да пераказу. Экзамен па гісторыі Беларусі ў 2023 годзе будуць здаваць не адзінаццацікласнікі, а дзевяцікласнікі, з якімі нашмат складаней працаваць з пункту гледжання светапогляднай карціны і ў цэлым карціны разумення гістарычнай спадчыны нашай краіны. Акрамя таго, змяніўся і змест экзаменацыйнага білета. Апроч традыцыйнага пытання, якое мае на ўвазе кампанент ведаў, будзе ўведзена пытанне, дзякуючы якому выпускніку трэба будзе прадэманстраваць уменне працаваць з архіўным матэрыялам, з тымі ці іншымі картамі, дакументамі мінулых гадоў. Мы павінны навучыць дзяцей супастаўляць і думаць. Навучыцца гэтаму, проста прачытаўшы кнігу або падручнік, немагчыма. Гэта тая работа, якую нам трэба праводзіць на кожным уроку. Мяркую, што нашы настаўнікі гісторыі дастойна пройдуць гэты экзамен разам са сваімі навучэнцамі.

Таксама Андрэй Іванец праінфармаваў педагогаў аб выніках правядзення рэпетыцыйнага цэнтралізаванага экзамену.

— Рэпетыцыя паказала, што прынятая складанасць тэстаў, іх структура, а таксама шкала ацэнкі цалкам адпавядаюць неабходным крытэрыям: па-першае, базаваму ўзроўню школьнай праграмы, па-другое — рэальнаму ўзроўню паспяховасці навучэнцаў. Кожны трэці школьнік пацвердзіў на рэпетыцыйным цэнтралізаваным экзамене адзнаку, якая была яму выстаўлена ў другой чвэрці. Трэцяя частка навучэнцаў здала тэст на адзнаку крыху вышэйшую за школьную і трэцяя частка — на ніжэйшую. У цэлым мы бачым, што ў навучэнцаў яшчэ ёсць час, каб падцягнуць свае веды, — паведаміў кіраўнік ведамства.

У будучыні ў Беларусі плануюць пашырыць пералік ліцэяў, выпускнікі якіх будуць паступаць у ВНУ без іспытаў.

«Ужо з гэтага года ў адпаведнасці з указам кіраўніка дзяржавы выпускнікі шэрагу ліцэяў устаноў вышэйшай адукацыі маюць магчымасць без экзаменаў пры ўмове добрай паспяховасці — гэта восем балаў па ўсіх агульнаадукацыйных прадметах і дзевяць балаў па профільных прадметах — паступаць у адпаведныя ўніверсітэты без экзаменаў. Такіх ліцэяў у нас вызначана пакуль тры: гэта ліцэі БДУ, Беларуска-Расійскага ўніверсітэта і Палескага дзяржуніверсітэта. Мы правялі аналіз і бачым, што сёння фактычна кожны другі выпускнік гэтых навучальных устаноў мае права без экзаменаў паступіць у адпаведную ўстанову адукацыі па сваім профілі», — расказаў Андрэй Іванец.

Міністр адзначыў найшырэйшы выбар спецыяльнасцяў, даступны гэтай катэгорыі выпускнікоў. «Фактычна маладыя людзі могуць паступаць без іспытаў на любую спецыяльнасць, на любы факультэт, дзе іх профільны прадмет з'яўляецца першым для паступлення і яны маюць па гэтым прадмеце ў атэстаце не менш як дзевяць балаў. Сёння мы праводзім вялікую работу з бацькоўскай грамадскасцю, з самімі выпускнікамі для таго, каб яны маглі скарыстацца гэтай унікальнай магчымасцю. Мяркую, пасля прымянення новай нормы сёлета мы правядзём сур'ёзны аналіз і налета распрацуем адзіныя падыходы для вызначэння пераліку ліцэяў, будзем далей пашыраць такую форму работы», — паабяцаў Андрэй Іванец.

Анансаваў міністр і яшчэ адну навацыю, якая закране ўсіх беларускіх школьнікаў. З наступнага навучальнага года ў Беларусі ўвядуць другі элемент школьнай формы. Па словах кіраўніка міністэрства, элементы школьнай формы з'яўляюцца адным з сур'ёзных момантаў выхаваўчай работы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

«Практычна ўсе школы поўнасцю адаптаваліся да новаўвядзення. Выкананне школьнага стандарту і дзелавога стылю з'яўляецца абавязковым для ўсіх устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Сёлета, мы мяркуем, усе школы дапоўняць абраны элемент формы другім элементам. Гэта будзе прыводзіць да нейкай аднастайнасці і разумення — як у бацькоў, так і навучэнцаў — прыналежнасці да канкрэтнай установы агульнай адукацыі. Выбіраць другі элемент формы, як і летась, будуць самі школы. Напрыклад, калі летась школа выбрала камізэльку, то сёлета можна будзе дапоўніць яе, напрыклад, штанамі, альбо белай кашуляй, альбо гальштукам. Тут мы не абмяжоўваем у выбары. Бацькі разам з настаўнікамі павінны правесці шырокае абмеркаванне», — падкрэсліў міністр.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Па законе

# БЯСПЕКА ЧАЛАВЕКА — ПРЫЯРЫТЭТ ДЛЯ ДЗЯРЖАВЫ

**Бяспека для кожнага з нас мае ключавое, вызначальнае значэнне, паколькі закранае ўсе бакі і патрэбы чалавека, грамадзяніна. Бяспека — найважнейшае сацыяльнае дабро, якое адпавядае агульным мэтам, інтарэсам і памкненням, якое выступае ў якасці неабходнай умовы як нармальнага функцыянавання грамадства ў цэлым, так і развіцця кожнага чалавека.**

Важным этапам у сістэмным гарантаванні бяспекі асобы ў Рэспубліцы Беларусь стала Дырэктыва Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 сакавіка 2004 г. № 1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны», якая вызначыла асноўныя напрамкі і меры па стварэнні бяспекі вытворчай дзейнасці і жыццядзейнасці насельніцтва.

Інфармацыйнае грамадства спараджае новыя рызыкі, выклікі і пагрозы, якія наўпрост закранаюць пытанні гарантавання бяспекі асобы, грамадства і дзяржавы. У сістэме прававых сродкаў забеспячэння бяспекі асобы і грамадства ключавое значэнне мае Канстытуцыя, асабліва яе палажэнні, прынятыя год таму на рэспубліканскім рэферэндуме. У прыватнасці, частка другая артыкула 28 абноўленай Канстытуцыі прадугледжвае, што дзяржава стварае ўмовы для абароны персанальных даных, бяспекі асобы і грамадства пры іх выкарыстанні. У Канстытуцыі ўпершыню ўжыты тэрмін «бяспека асобы і грамадства», што сведчыць аб найвышэйшым узроўні іх прававой абароны на практыцы.

Права на бяспеку асобы можа быць падвергнута пагрозе не толькі пры выкарыстанні персанальных даных і рэалізацыі грамадзянамі права на інфармацыю. Яно нябачна прысутнічае пры рэалізацыі іншых канстытуцыйных правоў і свабод, выступаючы ў якасці своеасаблівага права-гаранта, права-ўмовы развіцця асобы.

Акрамя гэтага палажэння, бяспеку асобы і грамадства забяспечваюць шматлікія іншыя нормы Канстытуцыі. Пры гэтым асаблівае месца ў ёй займаюць палажэнні бяспекі асобы. Напрыклад, паводле Канстытуцыі, дзяржава забяспечвае свабоду, недатыкальнасць і годнасць асобы (частка першая артыкула 25). Кожны мае права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго прыватнае жыццё, у тым ліку ад замаху на таямніцу яго карэспандэнцыі, тэлефонных і іншых паведамленняў, на яго гонар і годнасць (частка першая артыкула 28). З мэтай абароны гонару, годнасці, прыватнага і сямейнага жыцця грамадзян і поўнага ажыццяўлення імі сваіх правоў карыстанне інфармацыяй можа быць абмежавана заканадаўствам (частка трэцяя артыкула 34).

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у рашэнні ад 10 сакавіка 2022 года «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь» зрабіў выснову, што, зыходзячы з прынцыпу вяршэнства права, заканадаўцу трэба забяспечваць прававое рэгуляванне грамадскіх адносін, якое адпавядае прынцыпу канстытуцыйнай бяспекі асобы, усталёўваючы аб'ектыўна неабходныя і сацыяльна абгрунтаваныя прававыя абмежаванні і ўскладаючы дадатковыя абавязкі на грамадзян, выконваючы аптымальны баланс прыватных і публічных інтарэсаў, захоўваючы сутнасць і цэласнасць каштоўнасна-сэнсавага зместу канстытуцыйных правоў і свабод чалавека. Так, у інтарэсах бяспекі асобы яе правы і свабоды могуць быць абмежаваны ў адпаведнасці з часткай першай артыкула 23 Канстытуцыі. Прадугледжаныя першай часткай артыкула 41 Канстытуцыі, а таксама заканадаўствам аб працы здаровыя і бяспечныя ўмовы працы забяспечваюць рэалізацыю грамадзянамі канстытуцыйнага права на працу. Гарантаванне кожнаму права ўласнасці і яго ажыццяўленне магчыма пры выкананні наступных канстытуцыйных патрабаванняў: яно не павінна супярэчыць грамадскай карысці і бяспецы, наносіць шкоды навакольнаму асяроддзю і інш. (частка шостая артыкула 44 Канстытуцыі).

Такім чынам, бяспека чалавека з'яўляецца прыярытэтам для дзяржавы, паколькі стан абароненасці асобы ўяўляе сабой жыццёва важную патрэбу, умову, пры якой толькі і магчыма рэалізацыя канстытуцыйных правоў і свабод. Бяспека асобы забяспечвае кожнаму магчымасць не толькі ажыццяўляць свае правы, свабоды і абавязкі ў мірным, рэальным жыцці, але і абараняць іх у судах, пракуратуры, органах выканаўчай улады. Права на бяспеку варта разглядаць у якасці элемента сістэмы правоў чалавека або адным з асноўных правоў-гарантый чалавека.

Разам з тым бяспека асобы непасрэдна залежыць ад бяспекі грамадства і дзяржавы, якія таксама забяспечваюцца нормамі Канстытуцыі. Напрыклад, Канстытуцыяй абвешчана, што Рэспубліка Беларусь развівае атамную энергетыку ў мірных мэтах, гарантуе бяспеку пры вытворчасці і выкарыстанні атамнай энергіі (частка трэцяя артыкула 46). У аснове ўсіх відаў бяспекі (дзяржаўнай, грамадскай і асабістай) ляжыць Канстытуцыя, складаючы канстытуцыйную бяспеку, гарантаванне якой з'яўляецца залогам забеспячэння абароны асноўных правоў чалавека і найбольш важных інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы ад унутраных і знешніх пагроз.

**Анатоль ЦІКАВЕНКА,**
**суддзя Канстытуцыйнага Суда.**

# НЕАПРАЎДАНАЯ РЫЗЫКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ,** сёлета першыя ўзгаранні ў экасістэмах былі зафіксаваны ў лютым. Пік падобных узгаранняў, па яго словах, прагназуецца на сакавік-красавік. «Для таго каб пазбегнуць падобнай сітуацыі, як у мінулым годзе, усе органы і падраздзяленні па надзвычайных сітуацыях праінфармаваны аб праблематыцы, прымаюцца неабходныя меры па прафілактыцы такіх узгаранняў, прыведзены ў гатоўнасць сілы і сродкі, эксплуатацыя тэхнікі забяспечана на высокім узроўні, — адзначыў Яўген Бараноўскі. — Сёння мы гатовы да таго, каб рэагаваць на магчымыя наступствы, але разам з тым усё залежыць ад людзей, ад выканання імі элементарных правілаў бяспекі».

## Ахопленыя полымем

Як правіла, ахвярамі пажараў, што ўзнікаюць падчас спальвання травы, становяцца пенсіянеры, якія наводзяць парадак на сваіх участках. Па прыклады далёка хадзіць не трэба. 25 жніўня 2022 года адбыўся пажар — у вёсцы Дзмітрыеўка Добрушскага раёна. Як высветлілася, 77-гадовы мужчына спальваў каля свайго ўчастка смецце, з-за чаго загарэліся пажніўныя рэшткі ў полі. Спрабуючы самастойна патушыць пажар, пенсіянер атрымаў апёкі і быў шпіталізаваны.

Большасць трагедый адбываецца, калі пры спальванні смецця людзі выкарыстоўваюць лёгкаўзгаральныя вадкасці. У прыватнасці, 4 чэрвеня мінулага года недалёка ад вёскі Аксакаўшчына Мінскага раёна атрымала апёкі 32-гадовая жанчына. Яна наводзіла парадак на тэрыторыі дачнага ўчастка ў садовым таварыстве «Крыніца-2009»: спальваючы смецце, палівала яго лёгкай на загаранне вадкасцю. Жанчына не паспела і заўважыць, як расліннасць навокал загарэлася. У лічаныя хвіліны і сама гаспадыня была ахоплена полымем — на ёй загарэлася адзенне. Пасля ў пацярпелай дыягнаставалі тэрмічныя апёкі 18 % цела I, II, III і IV ступеняў.

— Заканамернасць такіх пажараў у тым, што людзі наўмысна спальваюць сухую траву і смецце, не задумваючыся аб наступствах, — заўважае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Іх жаданне такім чынам навесці парадак на сваім участку часцей за ўсё нясе толькі разбурэнні і матэрыяльныя страты. Полымя, якое разбушавалася, цяжка спыніць, а пацярпець можа не толькі маёмасць, але і сам падпальшчык.



На жаль, вядомыя выпадкі, калі выпальванні сухой травы прыводзілі да самых цяжкіх наступстваў — гібелі людзей. У сярэдзіне жніўня трагедыя здарылася ў вёсцы Запясочча Жыткавіцкага раёна. Пасля таго як агонь знішчыў 15 сотак іржышча на ўчастку прыватнага домаўладання, ён перакінуўся на насаджэнні пшаніцы сельгаспрадпрыемства, дзе знішчыў 0,03 га хлебнай культуры. Супрацоўнікам МНС удалося выратаваць 11,97 га пшаніцы. Гаспадара ўчастка знайшлі на пшанічным полі. Мужчыну шпіталізавалі ў бальніцу з апёкамі спіны, грудзей, абедзвюх рук і жывата рознай ступені. Як потым высветлілася, 82-гадовы пенсіянер вырашыў навесці парадак на прысядзібным участку, выпальваючы пажніўныя рэшткі і ржышча пасля ўборкі збожжавых, і не заўважыў, як агонь перакінуўся на пшанічную ніву. Гаспадар спрабаваў сам патушыць узгаранне і атрымаў апёкі. Пазней ад атрыманых траўм пацярпелы памёр у бальніцы.

## За выпальванне травы — да крымінальнай адказнасці

Рызыкуючы ўласным здароўем і нават жыццём, многія нават не падазраюць, якую шкоду наносяць навакольнаму асяроддзю, калі з дапамогай агню спрабуюць прыбраць леташнюю траву. Травяныя палы хутка распаўсюджваюцца, асабліва ў ветранае надвор'е. Агонь раздзімаецца імгненна, яго вельмі складана ўтрымаць і спыніць. Спальванне смецця на прысядзібным участку ці проста паблізу будынкаў можа стаць прычынай узгарання і нанесці шкоду пабудовам, а то і ўвогуле іх знішчыць.

Нярэдка на вачах вінаватых у пажарах агонь перакідваўся на жылыя дамы і пабудовы. Такі выпадак адбыўся год таму ў вёсцы Руда Ліпічанская Мастоўскага раёна. 26 сакавіка каля 16 гадзін дня гаспадары аднаго з дамоў вырашылі навесці парадак на сваім падворку: у вялікую кучу было сабрана ўсё назапашанае «дабро», чыркнула запалка — а далей пайшло не па плане. Моцны вецер у лічаныя секунды разнёс полымя на дзясяткі метраў, тут жа схапілася сухая трава. Гаспадары патэлефанавалі ў МНС тады, калі агонь ужо перакінуўся на пабудовы. Каб суняць полымя, ратавальнікам спатрэбілася больш як дзве гадзіны, дзесяць пажарных разлікаў. Акрамя таго, у тушэнні ўзгарання былі задзейнічаны работнікі лясгаса і мясцовага сельгаспрадпрыемства на спецтэхніцы. Пажарам былі знішчаны два жылыя і тры нежылыя дамы, 17 гаспадарчых пабудоў.

Пры выбары спосабу ўтылізацыі смецця ратавальнікі рэкамендуюць аддаваць прыярытэт бяспечным. Калі вы ўсё ж вырашылі развесці вогнішча ў сябе на падворку, то не варта грэбаваць простымі правіламі бяспекі. Па-першае, калі ўжо і спальваць смецце, то абавязкова ў зацішнае надвор'е. Вогнішчы лепш разводзіць удалечыні ад будынкаў, лясоў ці сціртаў саломы. Катэгарычна не дапускаецца выпальваць сухую расліннасць, іржышча, разводзіць вогнішчы на тарфяных грунтах, пад кронамі дрэў, выкарыстоўваць для распальвання вогнішчаў і вугалю лёгкаўзгаральных і гаручых вадкасцяў (за выключэннем вадкасцяў, спецыяльна прызначаных для распальвання).

Трэба заўважыць, што парадак наводзяць не толькі на асабістых падворках, але і на прыдарожных тэрыторыях. У выніку такіх «генеральных прыборак» часам пакутуе прыпаркаваны паблізу транспарт. Пры парывістым ветры агонь распаўсюджваецца вельмі хутка — і ліквідаваць яго няпроста. 14 красавіка 2022 года ратавальнікам паступіла паведамленне аб узгаранні сухой расліннасці на Барысаўскім тракце ў горадзе Лепелі. Калі падраздзяленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях прыбылі да месца выкліку, там гарэла не толькі сухая трава, але і легкавы аўтамабіль «Мэрсэдэс Віта». Ратавальнікі ліквідавалі ўзгаранне, ніхто не пацярпеў. У выніку гарэння травы былі пашкоджаны тры аўтамабілі.

Як нагадваюць у МНС, у нашай краіне выпальванне сухой расліннасці забаронена законам. Згодна з артыкулам 16.40 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, за незаконнае выпальванне сухой расліннасці, траў, а таксама ржышча і пажніўных астаткаў на палях ўвазе аматараў адпачынку на прыродзе. І ўсё было б добра, калі б, адпраўляючыся на «шашлыкі», грамадзяне выконвалі правілы бяспекі пры развядзенні вогнішчаў, прыбіралі пасля сябе тэрыторыю. Як паказвае практыка, аб гэтым адпачывальнікі думаюць у апошнюю чаргу або не клапоцяцца ўвогуле: забываюць патушыць вогнішчы, кідаюць у траву недакуркі. І мала хто задумваецца аб тым, што недакурак на полі з сухой травой правакуе ўзгаранні на значнай плошчы. Парывамі ветру агонь разносіцца на вялікія адлегласці, знішчаючы ўсё на сваім шляху.

— Каб адпачынак на прыродзе быў сапраўды бяспечным, выкарыстоўвайце мангал або грыль толькі пры ўмове забеспячэння бесперапыннага кантролю за працэсам гарэння і тлення, — звяртае ўвагу Анастасія Швайбовіч. — Пры або непрыняцце мер па ліквідацыі выпальванняў вінаватыя асобы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ў памеры ад 10 да 30 базавых велічынь. За развядзенне вогнішчаў у забароненых месцах прадугледжана накладанне штрафу да 12 базавых велічынь. У выпадку прычынення ўрону ў асабліва буйным памеры надыходзіць крымінальная адказнасць.

## Што трэба ведаць аматарам шашлыкоў

Ратавальнікі нагадваюць пра яшчэ адну вясновую «праблему», маючы на распальванні не выкарыстоўвайце гаручыя вадкасці. Не пакідайце ў месцах адпачынку непатушаныя вогнішчы, запалкі, недакуркі, шкляныя бутэлькі (на сонца яны працуюць як павелічальнае шкло, факусіруюць сонечнае святло і падпальваюць траву). І калі вы сталі сведкамі ўзгаранняў у экасістэмах, не праходзьце міма! Пры немагчымасці патушыць пажар самастойна, паведамляйце аб гэтым ратавальнікам па нумары 101 або 112.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота прэс-службы Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.**

### Асноўныя правілы пры развядзенні вогнішчаў, спальванні смецця:

- разводзіць вогнішчы варта пры ўмове забеспячэння бесперапыннага кантролю за працэсам гарэння і тлення;
- месца для развядзення вогнішчаў павінна быць ачышчана ад гаручых рэчываў і матэрыялаў, сухой расліннасці;
- у даступнасці неабходна мець ёмістасць з вадой, пяском ці вогнетушыцель, каб хутка патушыць полымя;
- працэс гарэння павінен ажыццяўляцца такім чынам, каб полымя і іскры не траплялі на гаручыя элементы будынкаў і збудаванняў, дзе захоўваюцца гаручыя рэчывы і матэрыялы;
- сыходзячы, неабходна затушыць вуглі да поўнага спынення тлення.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Шатландыі пачаліся выбары першага міністра



У Шатландыі выбіраюць новага лідара Шатландскай нацыянальнай партыі (SNP), якая знаходзіцца ва ўладзе, і, адпаведна, першага міністра краіны, паведаміла The Guardian. Галасаванне працягнецца два тыдні, чакаецца, што вынікі будуць абвешчаны 27 сакавіка. За пасаду змагаюцца міністр аховы здароўя Хумза Юсаф, міністр фінансаў і эканомікі Кейт Форбс і экс-міністр грамадскай бяспекі Эш Рыган. Паводле даных апытання кампаніі Ipsos, 33 працэнты апытаных членаў SNP лічаць, што Юсаф з'яўляецца найлепшай кандыдатурай на пасаду першага міністра Шатландыі і лідара партыі. Пры гэтым 32 працэнты сцвярджаюць тое ж самае аб Форбс. Рыган падтрымліваюць 10 працэнтаў, у той жа час 13 працэнтаў лічаць, што ніхто з іх не падыходзіць на пасаду. Як вядома, першы міністр Шатландыі абіраецца галасаваннем у парламенце, і тэхнічна любы дэпутат можа заняць гэтую пасаду, аднак звычайна на яе абіраецца лідар кіруючай партыі.

## Аўстралія накіруе $245 млрд на будаўніцтва атамнага падводнага флоту



Пра гэта заявіў галоўны дзяржказначэй краіны Джым Чалмерс, паведаміла ТАСС. Паводле яго слоў, будаўніцтва атамных субмарын будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з пагадненнямі, дасягнутымі краінамі альянсу AUKUS (Аўстралія, ЗША і Вялікабрытанія). Праграма будаўніцтва разлічана да сярэдзіны 2050-х гадоў. Для яе рэалізацыі спатрэбіцца павялічыць абаронны бюджэт Аўстраліі з 2,11 працэнта да 2,6 працэнта ВУП. Чалмерс адзначыў, што стварэнне падводнага флоту запатрабуе значнага фінансавання, што акажа ціск на бюджэт краіны. Тым не менш ён лічыць, што рэалізацыя дадзенай праграмы ў перспектыве прынясе вялікую карысць Аўстраліі з пункту гледжання эканомікі і нацыянальнай бяспекі.

## Звыш 100 чалавек сталі ахвярамі ўрагану «Фрэдзі» ў Малаві і Мазамбіку



Як паведаміў малавійскі дэпартамент па барацьбе са стыхійнымі бедствамі (DoDMA), з-за паводак і апоўзняў, справакаваных пралўнымі дажджамі з ураганным ветрам, у краіне загінулі 99 чалавек, 16 лічацца зніклымі без вестак. Больш за ўсё смерцяў зафіксавана ў акрузе Блантайр — 85 загінулых. Цяпер працягваюцца пошукава-выратавальныя работы, арганізавана 39 лагераў для пацярпелых. У Мазамбіку, які таксама аказаўся пад ударам урагану, загінулі пяць чалавек, піша інфармагенцтва Associated Press са спасылкай на мясцовыя ўлады. Ураган «Фрэдзі» абрынуўся на Малаві і Мазамбік у мінулую суботу. Раней пад удар цыклону трапіў Мадагаскар, паведамлялася аб чатырох загінулых. Чакаецца, што хутка стыхія аслабее і вернецца ў Індыйскі акіян. Дарэчы, «Фрэдзі», які ўтварыўся каля берагоў Аўстраліі ў пачатку лютага, стаў самым доўгайграючым з зарэгістраваных ураганаў.

# Атэлі для птушак

**Днямі ў адным са сквераў Савецкага раёна Гомеля з'явіліся шпакоўні, якія больш нагадваюць арт-аб'екты. Арыгінальныя домікі для птушак — карысная для горада ініцыятыва, якую ажыццявіў калектыў гомельскага прадпрыемства «Кірмаш». Аўтар ідэі — дэпутат Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў, дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Кірмаш» Уладзіслаў ЗАБІЯКА. Яго прапанова — не толькі зрабіць прыгожым месца адпачынку, але і правесці конкурс на найлепшую аўтарскую шпакоўню.**

Арыгінальныя птушыныя домікі работнікі прадпрыемства развесілі падчас нядаўняга раённага суботніка ў Кірмашаўскім скверы. Гэтую зялёную зону калектыў добраўпарадкаваў тры гады таму. Падчас вясновага і восеньскага месячнікаў па навядзенні парадку ў Савецкім раёне падвязвалі, рэгулярна палівалі дрэўцы. У выніку дабіліся амаль стапрацэнтнай прыжывальнасці саджанцаў. Каля ўвахода ўстанавілі памятныя камяні з



назвай сквера і подпісамі людзей, якія бралі непасрэдны ўдзел у закладцы зялёнай зоны. Сярод дрэў размясціліся драўляныя скульптуры і лаўкі. Цяпер калектыў прадпрыемства зноў вырашыў упрыгожыць сквер ды адначасова паклапаціцца аб птушках.

Па словах Уладзіслава Забіякі, да «будаўніцтва» шпакоўняў падышлі вельмі адказна: вывучылі патрабаванні «эрганомікі» птушыных домікаў. Іх збілі з натуральнага дрэва без якой-небудзь апрацоўкі. Пасля зборкі, каб служылі як мага даўжэй, вонкавую паверхню вырабаў абпалілі. Такія шпакоўні сталі асновай для далейшых творчых эксперыментаў і стварэння сапраўдных арт-кампазіцый.

Адразу тры птушыныя домікі для ўдзелу ў конкурсе змайстраваў работнік рамонтна-транспартнага ўчастка «Кірмаша» Сяргей Кустачоў. Прызнаецца, што для яго выклікам стала спалучыць функцыянал — аптымальны для птушак памер адтуліны і ўнутраны аб'ём хаткі — і дэкор. Выручыла даўняе захапленне разьбой па дрэве.

З творчым азартам уключыўся ў работу і галоўны інжынер прадпрыемства Канстанцін Шчыгліnскі. Ён зрабіў тры домікі. У ход пайшлі старыя жаночы капялюш і гіпсавы анёл.

— Знайшоў на лецішчы пластыкавую талерку, вазон са штучнымі кветкамі і бляшаную палівалку. Падумаў, чаму б усё гэта не прыстасаваць пад птушыную хатку? Сабраў прадметы ў адну кампазіцыю, у выніку атрымалася нешта, што нагадвае кавамашыну. Спадзяюся, птушкам такі домік прыйдзецца даспадобы, — падзяліўся Канстанцін Іванавіч.

Шпакоўні ў Кірмашаўскім скверы замацаваныя выключна на дарослых дрэвах. Каб не пашкодзіць ствалы, хаткі прымацоўвалі сцяжкамі, ствалы не свідравалі. Прадугледзелі майстры і сістэмную прыборку домікаў, а пры неабходнасці — рамонт.

Дарэчы, шпакоўні — не адзіны прыклад творчага падыходу калектыву прадпрыемства да добраўпарадкавання. Прыпынак у выглядзе пажарнай машыны на Рэчыцкім праспекце, незвычайная ўваходная група і чаша старога фантана ў парку Фестывальны, якія рэканструявалі ў дзіцячую гульнявую пляцоўку, — усё гэта работа «Кірмаша».

— У нас шмат новых задум. У хуткім часе заменім інфармацыйны стэнд на месцы гарадзішча жалезнага веку на тэрыторыі сучаснага мікрараёна Шведская Горка. Установім валун з металічнымі таблічкамі, якія паведамяць, што гэтае месца з'яўляецца помнікам археалогіі і ахоўваецца дзяржавай, — падзяліўся Уладзіслаў Забіяка. — У планах на бягучы год зрабіць падарунак да 50-годдзя Савецкага раёна Гомеля: пасадзіць Алею здароўя. На прадпрыемстве мы пачалі вырабляць тратуарную плітку: вылажым пляцоўку і на ёй установім вулічныя трэнажоры. Гэта, дарэчы, была просьба выбаршчыкаў. Адкрыць Алею здароўя плануем альбо ў парку Фестывальны, альбо ў новым Скверы ратавальнікаў, які хутка будзем добраўпарадкоўваць разам з Гомельскім абласным упраўленнем МНС.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

# УВАГА: НЕБЯСПЕЧНЫ ТАВАР

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



моўнік. — Разбіраліся з няроўнасцямі на дарозе. Мужчына з райцэнтра паведаміў, што дарога ў іх горадзе няроўная і гэта можа паўплываць на стан яго аўто. Выязджалі, разбіраліся, факт пацвердзіўся. Прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці арганізацыю, якая абслугоўвае дарогі. Было рэкамендавана ўстанавіць знакі, якія б абмяжоўвалі хуткасць транспарту.

Заяўнік паведаміў інспекцыі, што ў магілёўскай краме вага расфасаванага сыру не адпавядае лічбам на ўпакоўцы. Факт пацвердзіўся. Інфармацыю накіравалі ў вышэйшую арганізацыю.

Не заўсёды ўказваецца інфармацыя аб даце вырабу, умовах і тэрміне захоўвання. Быў выпадак, калі ў краме адкрылі заводскую тару з каўбасой, але дату і час, калі гэта адбылося, не зафіксавалі, — гэта грубыя і небяспечныя для спажыўцоў парушэнні.



Дагэтуль сустракаюцца нядобрасумленныя гандляры, якія практыкуюць стары як свет метад — непавераныя вагі. Інспектары настойліва рэкамендуюць спажыўцам звяртаць увагу і на гэта. Нядаўна такі факт быў засведчаны ў адным з гандлёвых цэнтраў, дзе парушальнік арандаваў месца.

Даводзілася супрацоўнікам інспекцыі разглядаць таксама зварот наконт мэблі. Вытворца не абцяжарваўся якасцю сваёй прадукцыі, рэалізоўваў яе без дэкаратыўнага пакрыцця на тарцах, са слядамі карозіі на металічных дэталях, расколінамі, падцёкамі клею і іншымі недапрацоўкамі.

Была прэтэнзія на якасць дзіцячага абутку з адкрытай пятачнай часткай. Да ведама: для дзяцей да трох гадоў гэта недапушчальна.

Хоць бывае, што і спажывец не заўсёды мае рацыю. Не пацвердзілася, напрыклад, скарга на павідла вытворцы з Магілёўскай вобласці. Чалавек наракаў на тое, што там шмат цукру, мала яблыкаў і наогул няма характэрнай кіслінкі. Аднак спецыялісты высветлілі, што ўсё ў норме.

## ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ САМАСТОЙНАСЦІ

Сёлета супрацоўнікі інспекцыі адзначаюць невялікі юбілей. Гэта не значыць, што раней яе не існавала — яна функцыянавала ў складзе Магілёўскага і Бабруйскага цэнтраў стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі. Дзесяць гадоў таму інспекцыя стала асобным структурным падраздзяленнем. У яе штаце сёння працуе 45 чалавек, з якіх 24 — інспектары, якія штодзённа маніторац прадукцыю на прадмет адпаведнасці яе рэгламентам ЕАЭС.

— Мы вельмі ганарымся, што працуем на карысць грамадства, — кажа Наталля Жукава. — Наша місія — папярэджваць людзей, каб яны не трапілі ў пастку, ведалі свае правы і ўмелі іх адстойваць. Апошнім часам у краіне шмат што зроблена для абароны спажыўцоў. Дзесяць гадоў таму, калі квітнеў чаўночны бізнес і народ завозіў у краіну на продаж цалкам абязлічаны тавар, інспекцыя вяла вялікую тлумачальную работу наконт тэхнічных рэгламентаў. Цяпер яны надзейна абараняюць інтарэсы пакупніка. І не толькі. Падчас так званых малочных і іншых прадуктовых войнаў у адносінах да беларускіх вытворцаў супрацоўнікі Дзяржстандарту праводзілі разам з іншымі спецыялістамі даследаванні, высвятлялі прычыны неадпаведнасці тавару рэгламентам.

Сёння спецыялісты Дзяржстандарту ініцыіруюць правядзенне круглых сталоў, выконваюць функцыю кансультантаў.

— Галоўная наша місія — абарона рынку ад няякаснай прадукцыі, — удакладняюць у інспекцыі. — Адна справа — спажывец купіў прадукт, а ён аказаўся няякасны. Гэта відавочнае парушэнне. А ёсць такія, якія адразу не ўбачыш. Напрыклад, у прадукце знаходзіцца недапушчальная харчовая дабаўка і спажывец гэтага не ведае, але арганізм акумулюе дабаўкі, і з часам гэта можа выклікаць захворванне. 29-ы рэгламент цалкам прысвечаны харчовым дабаўкам. Кансерванты, фарбавальнікі, стабілізатары — поўная інфармацыя на гэты конт. На сайце Дзяржстандарту яна таксама ёсць.

Спецыялісты заклікаюць спажыўцоў быць больш уважлівымі, не грэбаваць інфармацыяй, якая нанесена на прадукцыю, і вучыцца спажывецкай адукаванасці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

## РЭЕСТР У МАБІЛЬНЫМ ВАРЫЯНЦЕ

— Асноўная ўвага ўдзяляецца імпартнай харчовай, электратэхнічнай і дзіцячай прадукцыі, на якую сёння паступае шмат нараканняў, — адразу ж удакладняе **намеснік начальніка інспекцыі дзяржнагляду за выкананнем патрабаванняў тэхрэгламентаў і стандартаў Дзяржкамітэта па стандартызацыі Наталля ЖУКАВА.** — Праверкі праводзім як выбарачныя, так і пазапланавыя. Апошнія арганізоўваюцца, калі паступае інфармацыя, што ў пастаўшчыка знаходзіцца небяспечная для спажыўца прадукцыя. Бяруцца яе ўзоры і накіроўваюцца на лабараторныя выпрабаванні. Пры выяўленні небяспекі прапаноўваецца забарона абароту гэтай прадукцыі на тэрыторыі краіны.

Летась па выніках нашых праверак была накладзена забарона на ўвоз 183 найменняў тавараў. Гэта ў асноўным харчовая, электратэхнічная прадукцыя, тавары для дзяцей, мыйныя сродкі, шклоачышчальнікі і іншыя. Былі, напрыклад, прэтэнзіі па нітратах да аднаго расійскага пастаўшчыка дзіцячага харчавання. Ён гэта ўлічыў, і паўторныя праверкі паказалі, што яго прадукцыя бяспечная. Наогул, нярэдка знаходзім у імпартных таварах фарбавальнікі, якія ўплываюць на дзіцячую псіхіку. І часта інфармацыя пра іх наяўнасць не пазначана на ўпакоўцы. У нашых інспектараў спрацоўвае прафесійнае чуццё. Дарэчы, у 70 працэнтах выпадкаў пацвярджаецца, што падазроная прадукцыя не адпавядае рэгламентам Мытнага саюза.

На сайце Дзяржстандарту ёсць Рэестр небяспечнай прадукцыі, забароненай да ўвозу і абарачэння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з фатаграфіямі. Але яна ўсё роўна сустракаецца ў гандлі. Ёсць суб'екты гаспадарання, якія кіруюцца тым, што кошт такога тавару нізкі і яго рэалізацыя дае хуткі прыбытак. Першы раз інспектары паведамляюць, што тавар небяспечны і ад яго трэба пазбавіцца. Калі пры чарговай праверцы забаронены тавар зноў фігуруе, вінаваты прыцягваецца да адказнасці, а на рэалізацыю прадукцыі накладваецца забарона.

Тавар, які трапляе пад вета, вельмі часта пагражае здароўю чалавека. Таму спажыўцу карысна мець пад рукой рэестр. Ёсць афіцыйны тэлеграм-канал Дзяржстандарту «Бяспека і якасць», пры падпісцы на які ёсць магчымасць атрымліваць свежую інфармацыю адразу ж на тэлефон.

Да ведама: правяраюцца не толькі крамы, але і вытворцы, пастаўшчыкі паслуг і гэтак далей. Вельмі шмат Дзяржстандарт працуе з Будняглядам: кантралюе якасць будаўнічых матэрыялаў, наяўнасць дакументаў на адпаведнасць. Быў выпадак, калі на новабудоўлі ў Магілёўскім раёне па выніках праверкі інспекцыі дэманціравалі больш за тысячу метраў кабелю з-за таго, што ён не адпавядаў патрабаванням па таўшчыні ізаляцыі. Былі таксама прэтэнзіі да агароджы балконаў, лоджый, лесвіц, дзе адлегласць паміж вертыкальнымі элементамі была павялічана.

## СЫР НЕ ДАКЛАДАЮЦЬ, ВАГІ НЕ ПАВЯРАЮЦЬ

Работа са зваротамі грамадзян — адзін са складнікаў дзейнасці інспекцыі. Летась, напрыклад, сюды паступіла 50 зваротаў.

**Начальнік аддзела дзяржнагляду за выкананнем патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў і стандартаў Алег БУРАКОЎ** звяртае ўвагу, што спажыўцы часта дапамагаюць папярэдзіць парушэнні.

— Летась былі звароты па дзіцячых цацках, вырабах лёгкай прамысловасці, вокнах, мэблі, — пералічвае суразмоўнік. — Разбіраліся з няроўнасцямі на дарозе...

### Парады спажыўцам:

1. Купляйце прадукцыю ў сур'ёзных пастаўшчыкоў. Абавязкова звяртайце ўвагу на маркіроўку, наяўнасць дакументаў на прадмет адпаведнасці. Прагледзіце склад тавару. Яшчэ лепш — праверце, ці ёсць ён у рэестры.

2. Не ігнаруйце папярэджвальныя надпісы. Тыя ж папулярныя сярод дзяцей лізуны, цеста для лепкі, слаймы нельга даваць у рукі тым, хто маладзейшы за 14 гадоў. Да таго ж гэтыя тавары не заўсёды вытрымліваюць праверку на хімічную бяспеку.

3. Наогул, узроставыя абмежаванні па цацках — рэч сур'ёзная. Тыя ж цацкі-антыстрэс таксама разлічаны на дзяцей, старэйшых за 14 гадоў. Яны часта зашкальваюць па фармальдэгідзе і феноле. А на «гукавых» цацках часта прысутнічае надпіс: для гульні на адкрытым паветры. Калі такую цацку ўключыць у кватэры, маленькае дзіця можа спужацца.

Экабяспека

# АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ ТАРА:

## біяраскладальная, папяровая, шкляная, драўляная

**Забруджванне пластыкам наваколля — адна з найбольш вострых экалагічных праблем сучаснасці. Яна становіцца ўсё больш пагрозлівай па маштабах, і праліччыць яе наступствы немагчыма. Штогод у свеце выпускаецца да 330 мільёнаў тон пластыкавых вырабаў і палімераў, і амаль кожныя 15—20 гадоў гэтая лічба падвойваецца. Пры тым вырашыць пытанне ўтылізацыі пластыкавых адходаў нейкім адным спосабам нельга. Беларусь рэалізоўвае шэраг практычных мер, скіраваных на зніжэнне выкарыстання пластыкавай упакоўкі. План па паэтапным замяшчэнні выкарыстання такой тары і замяшчэнні яе экалагічна бяспечнай рэалізоўваецца з 2020 года і ўключае шэраг мерапрыемстваў. Што робіцца і плануецца ў краіне, каб пластыкавага смецця паменшала, расказалі спецыялісты галіны.**

### Дазвольныя дакументы на пластыкавыя адходы

Паколькі пытанні зніжэння выкарыстання пластыкавай упакоўкі не закранаюць кампетэнцыю шэрагу дзяржорганаў, то, каб арганізаваць эфектыўную работу па выкананні мерапрыемстваў плана, Мінпрыроды стварыў міжведамасны каардынацыйны савет, нагадала **Вольга САЗОНАВА, начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды:**

— Летась быў распрацаваны 41 дзяржаўны стандарт на аснове міжнародных і еўрапейскіх стандартаў у галіне вызначэння патрабаванняў да экалагічна бяспечнай упакоўкі, у тым ліку біяраскладальнай, і метадам яе выпрабавання. Плануецца таксама распрацаваць сем міждзяржаўных стандартаў.

Па ініцыятыве Беларусі на пляцоўцы Еўразійскай эканамічнай камісіі актыўна працягваецца работа па ўвядзенні ў Еўразійскім эканамічным саюзе (ЕАЭС) адзінай меры нетарыфнага рэгулявання адносна адходаў з пластмасы, якія ўвозяцца на тэрыторыю Мытнага саюза. Наша краіна рэгулюе ўвоз небяспечных адходаў, аднак пластмасы ў іх пералік не ўваходзяць (за выключэннем пластыку, забруджанага асабліва небяспечнымі рэчывамі і ўстойлівымі арганічнымі забруджвальнікамі). Плануецца, што для ўсіх краін ЕАЭС увядуць адзіны парадак, і адходы пластмас будуць увозіцца на тэрыторыю Беларусі толькі на падставе дазвольных дакументаў. У дачыненні да трэціх краін гэта будзе ліцэнзія, якую выдае Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (па ўзгадненні з Мінпрыроды). А ўнутры Мытнага саюза — дазвол ад Мінпрыроды.

— Увогуле, увоз адходаў у Беларусь магчымы толькі з мэтай выкарыстання, — падкрэсліла спецыяліст. — Нягледзячы на тое што ў краіне ёсць аб'екты па выкарыстанні пластмас, мы плануем увесці рэгуляванне ўвозу такіх адходаў. Паколькі такая норма зацверджана рашэннем ЕАЭС, цяпер карэкціруюцца нарматыўна-прававыя акты, якія рэгулююць гэтыя пытанні.

### Забарона — штуршок для развіцця

На завяршальнай стадыі работа па ўнясенні змен у тэхнічны рэгламент Мытнага саюза аб бяспецы ўпакоўкі. У дакумент плануецца ўвесці норму аб забароне выкарыстання этыкетак з полівінілхларыду на ўпакоўцы з поліэтылентэрафталату. Такая норма неабходная, каб забяспечыць магчымасць выкарыстання ПЭТ-упакоўкі, паколькі ПВХ-этыкеткі абцяжарваюць перапрацоўку.

Стварэннем тэхналогій і вытворчасці біяраскладальнай упакоўкі з айчыннай раслінай сыравіны займаецца НАН Беларусі. Распрацаваны саставы, якія ўтрымліваюць неарганічныя антыбактырыяльныя нана-дабаўкі для прамочвання паперы, працягнула Вольга Сазонава:

— Прымяненне прамочвання ў цэлым паляпшае эксплуатацыйныя ўласцівасці паперы, што дазваляе выкарыстоўваць іх пры вытворчасці тэрмазварвальнай паперы для экаўпакоўкі. Вядзецца навуковае даследаванне ўплыву экабяспечнай упакоўкі на якасныя характарыстыкі. У 2021-м была ўведзена забарона на выкарыстанне аднаразовага пластыкавага посуду, што падштурхнула вытворцаў да стварэння тары з папяровай і драўлянай тары (з'явіліся драўляныя відэльцы, папяровыя кубачкі і талеркі).

У краіне рэалізоўваецца комплекс мерапрыемстваў па мадэрнізацыі існуючых вытворчасцяў, якія працуюць з альтэрнатыўнай пластыкавай тары ўпакоўкай — папяровай і шкляной. Адзін з асноўных гульцоў на гэтым рынку — цэлюлозна-папяровае прадпрыемства канцэрна «Беллеспаперпрам». Гафрыраваная папера і ўпакоўка з яго — рыначная альтэрнатыва палімернай тары. Павялічваюцца таксама аб'ёмы вытворчасці шкляной тары. У краіне ўкаранілі і тэхналогію па выпуску аблегчанай танкасценнай шклатары, масавы выраб якой запланаваны сёлета ў першым квартале.

Ствараюцца і новыя вытворчасці па выпуску экалагічна бяспечнай упакоўкі, у тым ліку з прыцягненнем інвестыцый у межах Саюзнай дзяржавы, Кітая і краін дальняй дугі.



### Эканамічны стымул

Выраб экалагічнай упакоўкі, як правіла, даражэйшы, чым пластыкавай, таму з 2020-га ў Беларусі ўведзены механізм эканамічнага стымулявання — прынцып пашыранай адказнасці вытворцаў і пастаўшчыкоў для асобных відаў тавараў, нагадала Вольга Сазонава:

— Эканамічнае стымуляванне ажыццяўляецца за кошт павелічэння памеру платы для вытворцаў і пастаўшчыкоў пластыкавай тары і зніжэння такой платы для тых, хто пастаўляе і вырабляе экабяспечную ўпакоўку. Прадугледжана таксама кампенсацыя (яе выплачвае аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў) расходаў для арганізацый, якія выкарыстоўваюць шкляную шматабаротную тару для разліву і вырабу пітной вады на тэрыторыі Беларусі.

Шэраг арганізацыйных мер для павелічэння выкарыстання экаўпакоўкі прымаецца і буйнымі рытэйлерамі. З некаторымі з іх Мінпрыроды заключыла пагадненне аб супрацоўніцтве ў напрамку зніжэння выкарыстання пластыку. Гаворка не пра забарону і вызначэнне нейкіх мэтавых паказчыкаў, а пра выбар упакоўкі (пластыкавай ці экалагічнай), які гандлёвыя сеткі даюць пакупніку. Акрамя таго, крамы здольныя інфармаваць наведвальнікаў пра экаўпакоўку і шкоду пластыку, што таксама вельмі важна.

### Не ўсё карыснае, што называецца «біяраскладальным»

Сёння на Зямлі ўтварылася ўжо 8,3 млрд тон палімерных адходаў. 9 % з іх былі перапрацаваны ў другасныя матэрыялы, 12 % — спалены, а астатнія — захаваны на палігонах ці трапілі ў наваколле. Згодна са статыстыкай, кожны жыхар нашай краіны штогод ствараe 29,4 кілаграма пластыкавых адходаў, а ўсе разам — 290 тысяч тон палімерных адходаў.

— Як паказвае вопыт еўрапейскіх краін, толькі каля трацiны палімерных адходаў можна ўтылізаваць у якасці другаснай сыравіны метадам рэцыклінгу. Астатні аб'ём адходаў такім чынам перапрацаваць немагчыма, таму іх або спальваюць, або экспартуюць на перапрацоўку ў іншыя краіны, — заўважыў **Іван БАРАНОЎСКІ, намеснік дырэктара Інстытута жыллёва-камунальнай гаспадаркі НАН Беларусі.** — У краіне таксама падвяргаецца рэцыклінгу каля 30—32 % сабраных у якасці другасных матэрыяльных рэсурсаў пластыкавых адходаў. Паўстае пытанне: што рабіць з астатнімі? Лічыцца, што найбольш радыкальны спосаб барацьбы з пластыкам — замена палімернай упакоўкі біяраскладальнымі пластыкамі. Цяпер у свеце вырабляецца больш за сотню розных відаў такой прадукцыі, аднак іх аб'ём у агульным выпуску палімераў не перавышае 1 %.

Да таго ж не ўсе пластыкі, якія называюцца «біяраскладальнымі», насамрэч такія. У выніку раскладання ўмоўна-біяраскладальных матэрыялаў ствараецца мікрапластык, які потым усё роўна забруджвае навакольле і трапляе ў харчовыя ланцужкі, што нясе пагрозу для свету. Існуе тры віды палімераў, якія лічацца біяраскладальнымі: біядэградзіраваныя, оксараскладальныя і оксабіяраскладальныя. Сёння нідзе да канца не высветлена, у якіх умовах яны павінны раскладацца, якія спосабы ўтылізацыі і збору павінны да іх прымяняцца. Невядомы таксама час іх раскладання і кампаненты, якія будуць пры гэтым выдзяляцца і як яны будуць уплываць на наваколле.

### Маркіраваць, сабраць, перапрацаваць

Акрамя таго, што палімеры негатыўна ўздзейнічаюць на наваколле, яны яшчэ патрабуюць вялікіх затрат на ўтылізацыю. У краіне пакуль не хапае магутнасцяў для сартавання цвёрдых камунальных адходаў, таму іх значная частка не збіраецца і не перапрацоўваецца. Так што рашэнне «пластыкавай» праблемы вельмі залежыць яшчэ ад настрою і людзей, на раздзельны збор, і ад прадпрыемстваў, якія ствараюць такія адходы, дадаў спецыяліст:

— Па нашых разліках прыкладна палову палімераў немагчыма перапрацаваць. Гэта ўпакоўка з кампазітных матэрыялаў, тонкія поліэтыленавыя пакеты, моцна забруджаная ўпакоўка і тара. Іх перапрацоўкай бессэнсоўна займацца і з эканамічнага пункту гледжання, і з тэхналагічнага. Можна выкарыстоўваць такія матэрыялы ў выглядзе РДФ-паліва, аднак для гэтага таксама неабходна ствараць магутнасці, а гэта капітальныя затраты.

Можна распрацаваць і ўкараніць у жыццё біяраскладальныя пластыкі, аднак трэба яшчэ стварыць сістэму для іх збору і перапрацоўкі. Падобныя пластыкі адрозніваюцца па хімічным складзе ад звычайных. Трапляючы ў склад звычайных палімераў, яны псуюць нарыхтаваную сыравіну, перашкаджаючы яе перапрацоўцы. Каб збіралася асобна, біяраскладальныя пластыкі павінны мець адпаведную маркіроўку для хуткай ідэнтыфікацыі падчас сартавання, мяркуе Іван Бараноўскі:

— Неабходны таксама магутнасці (пляцоўкі) для перапрацоўкі біяраскладальных (кампаставаных) пластыкаў разам з арганічнымі адходамі. У асобным зборы біяраскладальных пластыкаў павінна ўдзельнічаць усё насельніцтва.

Інстытут ЖКГ НАН Беларусі да канца 2025 года плануе стварыць лабараторыю па выпрабаваннях біяраскладальнай упакоўкі. Эксперты мяркуюць, што дзякуючы яе рабоце будуць вызначаны дакладныя тэхнічныя патрабаванні да біяраскладальнай упакоўкі: сфармуляваны крытэрыі, якім яна павінна адпаведаць; вызначаны метады выпрабавання на адпаведнасць гэтай упакоўкі патрабаванням да біяраскладальнасці.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Навука

# Краіна з высокім інтэлектам

**Да 100 наведвальнікаў у хвіліну фіксавалі на ўваходзе на выстаўку «Беларусь інтэлектуальная», калі яна праходзіла ў сталічным выставачным комплексе «БелЭкспа». Пра гэта расказаў журналістам дырэктар Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Валерый ГАНЧАРОЎ.**

— Выстаўка «Беларусь інтэлектуальная» была арганізавана па даручэнні кіраўніка дзяржавы. Яна прайшла з вялікім поспехам у Мінску, Гомелі, Магілёве і Віцебску, далей яе чакаюць у Гродне і Брэсце. Ідэя выстаўкі нарадзілася пасля II з'езда беларускіх вучоных. У стратэгіі «Навука і тэхналогіі: 2018—2040» мы прапісалі «Беларусь інтэлектуальную» як тую мадэль грамадства, да якой будзем імкнуцца. Натуральна, што і мерапрыемствы, асабліва нацыянальнага маштабу, праводзім менавіта пад гэтым лагатыпам. Калі Нацыянальнай акадэміі навук было даручана арганізаваць дэманстрацыю апошніх дасягненняў навукі, мы скарысталіся выпадкам, каб яшчэ раз прасунуць нашу місію — пераўтварыць Беларусь у краіну з высокім інтэлектам. Інтэлект павінен быць галоўным фактарам вытворчасці. Менавіта на гэта мы робім упор, — падкрэсліў Валерый Ганчароў. — Экспазіцыя была арганізавана па кластарах, якія адлюстроўваюць галоўныя трэнды ў беларускай і сусветнай навуцы: у іх ліку — штучны інтэлект, IT-тэхналогіі, робататэхніка; інавацыйнае прыборабудаванне; электратранспарт і яго базавыя кампаненты; абараназдольнасць і ваенная навука; экалогія, прыродакарыстанне; біятэхналогіі; фармацыя, ахова здароўя, медыцына; аграпрамысловы комплекс, харчаванне; прастора маладзёжных ініцыятыў. Цэнтральнае ядро склалі топавыя распрацоўкі, атрыманыя ў апошнія гады, якія вылучаюцца найвышэйшым сусветным узроўнем навізны, а па перыферыі размясцілі распрацоўкі, якія ўжо актыўна прымяняюцца ў розных сферах нашага жыцця і эканомікі.

Адпрацаваную на сталічнай пляцоўцы канцэпцыю зараз прасоўваюць у абласных цэнтрах, паказваючы, апроч іншага, і развіццё рэгіянальнай навукі. Экспазіцыя ў кожным рэгіёне мае свой унікальны складнік, таму што там дзейнічаюць свае прадпрыемствы, навуковыя, адукацыйныя ўстановы і тэхнапаркі. Напрыклад, у Гомелі было прадстаўлена больш як 100 уласных экспанатаў, а наведалі экспазіцыю больш за 50 тысяч чалавек.

— Мы стараемся максімальна захаваць пераемнасць выстаўкі, каб кожны наведвальнік атрымаў дакладнае ўяўленне аб тым, як развіваецца і агульнанацыянальная, і рэгіянальная навука, — патлумачыў дырэктар Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі. — У абласных цэнтрах запланавана дадатковая дэманстрацыя менавіта мясцовых распрацовак. Некаторыя ўключаюць у склад ужо дзеючых кластараў, а іншыя размяшчаюць асобна, таму што рэгіянальны кантэкст вельмі спецыфічны. Мы дапамагаем калегам у рэгіёнах не толькі ў плане адбору распрацовак, але і ў максімальна выгаднай падачы экспанатаў. Таму што адна справа — проста паставіць на стэндзе скрыначку з лазерам, і зусім іншая — паказаць наведвальнікам, як ён працуе і дзе можа прымяняцца гэта тэхналогія.

Па словах Валерыя Ганчарова, паглядзець топавыя экспанаты на выстаўцы можна і за паўгадзіны, але ж калі прыглядацца, задаваць пытанні і атрымліваць адказы — гэта займае да трох гадзін. Фармат выставы дазваляе атрымаць інфармацыю як у сціснутым выглядзе, так і ў разгорнутым. Гэта залежыць выключна ад жадання і інтарэсаў наведвальніка.

16—19 сакавіка выстаўка «Беларусь інтэлектуальная» пройдзе ў Гродне.

— Яна разгорнецца ў Цэнтральным спартыўным комплексе па вуліцы Камунальная, — расказаў журналістам **старшыня камітэта эканомікі Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр КАМЕНДАНТ.** — Там пачаліся арганізацыйныя мерапрыемствы, частка абсталявання ўжо знаходзіцца ў Гродне. Бліжэй да выхадных пачнецца запаўненне выставачнай прасторы. Стараемся арганізаваць усё на годным узроўні. Мы бачым цікавасць з боку грамадзян, да нас ужо паступаюць званкі ад ахвотных і ўдзельнічаць, і наведаць экспазіцыю. Лічу, што ў першую чаргу дасягненні навукі трэба дэманстраваць нашым дзецям, але выстаўка, безумоўна, будзе цікавая ўсім.

Як заўважыў Валерый Ганчароў, Цэнтральны спартыўны комплекс у Гродне — вельмі цікавае па канфігурацыі збудаванне: «Шчыра кажу, што гэта быў выклік для нас — як размясціць там экспазіцыю выстаўкі. Мы заўсёды прадумваем аптымальны маршрут для наведвальнікаў. Дык вось у Гродне гэты маршрут будзе ўнікальны, таму раю наведаць выстаўку нават тым, хто ўжо знаёміўся з ёй у іншых абласных цэнтрах».

А фінішуе выстаўка «Беларусь інтэлектуальная» ў Брэсце. **Старшыня камітэта эканомікі Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта Наталля АЛЯХНОВІЧ** паабяцала, што будзе зроблена ўсё, каб мясцовым жыхарам было цікава яе наведаць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Лячэбнае меню

# СА СМАКАМ І ВОДАРАМ

## Як харчавацца пры язве страўніка?



**Раней лічылася, што язвавая хвароба страўніка — прэрагатыва маладых і халастых, хто актыўна робіць кар'еру, і ў асноўным мужчын-курцоў. Сёння дзяўчаты складаюць мужчынам сур'ёзную канкурэнцыю па ўсіх гэтых пазіцыях.**
**А ва ўзнагароду тым, хто дамагаецца раўнапраўя з мужчынамі ва ўсім, — тая ж язвавая хвароба страўніка або дванаццаціперснай кішкі.**

### ВЫНІК СТРЭСУ

Прычын узнікнення язвавай хваробы страўніка, як мяркуюць навукоўцы, некалькі. Вінаватае ў яе развіцці, па-першае, наша наплявацельскае стаўленне да здароўя ў цэлым і да харчавання ў прыватнасці. Асабліва ў маладыя, студэнцкія, халасцяцкія гады, калі аб трохразовым харчаванні і штодзённым супе засталіся толькі мары, а да стабільнага сямейнага жыцця было яшчэ далёка.

Акрамя таго, як і шматлікія хваробы дваццатага стагоддзя, язвавая хвароба страўніка часта — вынік стрэсу.

— Імпульс, які зарадзіўся ў мозгу ад раздражнення, ператвараецца ў каманду, што падганяе выпрацоўку страўнікавага соку, а ён, як вядома, складаецца галоўным чынам з агрэсіўнай салянай кіслаты. І тая адразу пачынае раз'ядаць сценкі страўніка, калі ён не запоўнены. Вось чаму гастраэнтэролагі — адзіныя з медыкаў, хто не адгаворвае нас заядаць стрэс, — кажа **урач ультрагукавой дыягностыкі 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Ганна РУДЗЬКО.**

### ДРОБНА І ЧАСТА

Задача лячэбнага харчавання пры язвавай хваробе — максімальна спрыяць аднаўленню нармальнай структуры ўнутранай слізістай паверхні страўніка, вось чаму трапезы цяпер павінны быць максімальна далікатнымі. Бо язва па сутнасці — адкрытая рана, якая рэагуе на расцягванне, дакрананне, тэмпературу, хімічнае ўздзеянне.

Таму, па-першае, харчаванне павінна быць дробным. Порцыі кожнага прыёму ежы павінны быць невялікімі, каб не расцягваць сценкі страўніка. Язвеннiку лепш аддаць перавагу шасціразоваму харчаванню, гэта значыць сілкавацца прыкладна праз кожныя тры гадзіны. Страўнік пры гэтым будзе заўсёды запоўнены ежай, якая нейтралізуе кіслату. Па-другое, неабходна выконваць «механічнае драбненне». Язвенніку перш за ўсё трэба навучыцца жаваць, бо буйныя, неразмякчаныя слізістай кавалкі ежы, кранаючы язву, здольныя і выклікаць моцны боль, і павялічыць ранку.

Але нават старраннае перажоўванне можа аказацца недастатковым, калі сама ежа грубая. Гэта здароваму чалавеку лустачкі бульбы фры, кавалак мяса ці хлеба здаюцца мяккімі. Язвенніку пра іх лепш забыцца, ужываць ежу толькі ў здробненым і працёртым выглядзе. І лепш зусім выключыць прадукты, якія змяшчаюць грубыя клетачныя абалонкі — рэпу, рэдзьку, радыску, спаржу, гарох і фасолю, няспелую і з грубай лупінай садавіну, гародніну, агрэст, парэчкі, вінаград, фінікі, яблыкі. Па-трэцяе, наймацнейшым раздражняльнікам язвы з'яўляецца неадпаведны хімічны склад ежы. Параўнаць яго можна з пасыпаннем соллю свежай раны. Таму неабходна не толькі абмежаваць ужыванне ўласна солі (да 8-10 г у дзень), але і цалкам выключыць вострыя запраўкі, воцат і любыя іншыя кіслоты, а таксама рэдзьку, радыску, цыбулю і часнок, грыбы.

Акрамя таго, хімічны склад ежы ўплывае і на страўнікавую сакрэцыю — вылучэнне кіслаты. Усе прадукты дзеляцца на слабыя і моцныя яе ўзбуджальнікі. Да першых адносяцца: малако і малочныя прадукты, крупяныя агародніннвя супы, вадкія кашы, добра вываранае мяса, свежая адварная рыба, яйкі ўсмятку або ў выглядзе амлету, белы хлеб, шчолачныя негазіраваныя воды, няцмоцны чай. Яны вам і патрэбныя, раіць урач.

Да моцных узбуджальнікаў страўнікавай сакрэцыі адносяцца гарчыца, карыца, хрэн, перац і іншыя вострыя прыправы, смажаныя, кансерваваныя і вэнджаныя стравы, моцныя булёны — мясныя, грыбныя, рыбныя; чорны хлеб, вырабы са здобнага цеста, моцны чай, кава, напоі, якія змяшчаюць алкаголь і вуглекіслату. Як бачыце, гаворка тут ідзе не столькі аб прадуктах, колькі аб канкрэтных стравах. Бо адзін і той жа прадукт, прыгатаваны рознымі спосабамі, па-рознаму ўспрымаецца страўнікам. Напрыклад, кавалак смажанага мяса здольны прынесці вам нямала пакут, а адвараны «праскочыць», не выклікаючы залішняй кіслотнасці.

Мае значэнне і кансістэнцыя ежы. Так, мяса кавалкам зноў такі раздражняе страўнік, даўжэй знаходзячыся ў ім. А здробненае ў фарш выводзіцца з яго нашмат хутчэй. Важны і тэрмічны рэжым харчавання. Занадта гарачая ці халодная ежа таксама раздражняе язву. Таму тэмпература гарачых страў не павінна перавышаць 60 градусаў, а халодных — быць меншай за 15 градусаў.

### МАРГАРЫНУ — НЕ, ПЮРЭ І СУПАМ — ТАК

Тлушчы валодаюць двухфазным дзеяннем. Спачатку яны нейтралізуюць вялікую колькасць кіслаты, а затым прадукты іх раскладання спрыяюць яе стымуляцыі. Але тлушчы маюць і механічнае дзеянне. Яны абвалакваюць страўнік, утвараючы як бы другую абалонку, і тым самым абараняюць слізістую ад кантакту з кіслатой. Такімі добрымі якасцямі ў поўнай меры валодае масла. Менш пажаданыя раслінныя алеі, з якіх найлепшы — самы лёгказасваяльны — аліўкавы.

Зусім выключаныя для язвеннікаў разнастайныя маргарыны. І ўсе тлушчы як жывёльнага, так і расліннага паходжання, павінны дадавацца толькі ў гатовыя стравы, не падвяргаючыся тэрмічнай апрацоўцы. Уплыў вугляводаў на развіццё язвавай хваробы таксама неадназначны. З аднаго боку, яны — асноўная крыніца мінеральных рэчываў, харчовых валокнаў, энергіі. Як правіла, вугляводы з'яўляюцца слабымі ўзбуджальнікамі страўнікавай сакрэцыі і таму карысныя пры язвавай хваробе. Пюрэ, супы з бульбы, морквы, гарбузоў, патысонаў, квяцістай капусты, памідораў, сокі з яблыкаў (без лупіны), са спелага вінаграду не раздражняюць страўнік. З іншага боку, вугляводы з'яўляюцца моцнымі раздражняльнікамі вегетатыўнай нервовай сістэмы, якая выклікае такія з'явы, як пачырваненне, патлівасць, сэрцабіцце і... вылучэнне страўнікавага соку. Акрамя таго, вугляводы нярэдка спрыяюць узздуццю страўніка, яго распіранню газамі (асабліва «грашыць» гэтым белакачанная капуста, язвеннікам яна не рэкамендуецца). Таму пры ўсёй каштоўнасці вугляводаў іх колькасць у вашым рацыёне скарачаецца.

### БАЛЬЗАМ ДЛЯ СТРАЎНІКА

Не будзем забываць і аб псіхалагічным аспекце: калі стрэс уздзейнічае на наша страваванне гібельна, то станоўчыя эмоцыі — проста бальзам. Перакусванне на хаду, усухамятку, за абмеркаваннем праблем ці чытаннем зусім не «задавальняе» яго. А вось прыгожая сервіроўка, прыемная кампанія, павольнае паглынанне ежы і выдатная музыка — увесь гэты рытуал нездарма існаваў стагоддзямі, дапамагаючы нашым продкам спраўляцца з дзясяткамі тлустых, вострых страў без асаблівай шкоды для здароўя. Толькі не варта рабіць з гэтага выснову, што можна без наступстваў аддавацца абжорству пад Чайкоўскага. Паспрабуйце самую «нішчымную» вячэру сервіраваць прыгожым посудам — і, паверце, прэсная працёртая гародніна набудзе незабыўныя водар і смак.

Скажыце, доктар...

# Секс патрэбны для здароўя?

## Уся праўда пра тое, калі, навошта і колькі



**Інтымныя адносіны з'яўляюцца крыніцай пазітыўных эмоцый, здымаюць псіхалагічнае напружанне, дораць прыемныя адчуванні, паляпшаюць настрой, дапамагаюць будаваць адносіны і прыхільнасць. Акрамя таго, секс — добры снатворны сродак. Часта можна пачуць, што жанчыне секс патрэбны для здароўя. Але ці так гэта? Ці можна яго палепшыць сексам? Разабрацца нам дапамагла ўрач-сексолаг Мінскага гарадскога клінічнага цэнтра псіхіятрыі і псіхатэрапіі Вольга НЕЎДАХ.**

***— Вольга Міхайлаўна, ці патрэбны секс жанчыне для здароўя?***

— Сама пастаноўка пытання па сутнасці няправільная. Здароўе — пераменная, якая даецца нам ад нараджэння. Яно можа пагаршацца ў выніку хвароб, вяртацца да зыходнага ўзроўню пасля выздараўлення — то-бок паляпшацца. А ці можна здароўе палепшыць сексам? Адназначнага адказу сапраўды няма.

Існуе міф, што жанчынам трэба займацца сексам для прафілактыкі гінекалагічных захворванняў, напрыклад, застойных з'яў у органах малога таза. Насамрэч фактарамі рызыкі варыкознага расшырэння вен малога таза з'яўляюцца цяжкая фізічная праца, шматразовыя цяжарнасці, роды, атлусценне і спадчыннасць.

Навукай не даказана, што адсутнасць палавых кантактаў у жанчыны — выразны фактар ва ўзнікненні нейкіх захворванняў.

***— Пры гэтым які-небудзь станоўчы ўплыў інтымных адносін на арганізм усё ж ёсць?***

— Вядома, што сексуальная актыўнасць станоўча ўплывае на работу сардэчна-сасудзістай і эндакрыннай сістэм. Зніжаецца рызыка сардэчных захворванняў, павялічваецца выпрацоўка гармонаў: тэстастэрону, эстрагену, аксітацыну, серанатану.

***— А ці дапамагае рэгулярнае палавое жыццё падоўжыць маладосць?***

— Так, рэгулярнае палавое жыццё дазваляе жанчынам аддаліць менапаўзу на дзесяць гадоў, як высветлілі даследчыкі з Універсітэцкага каледжа Лондана. Пры гэтым нават не абавязкова мець партнёра. Работа была апублікавана ў часопісе Royal Society Open Science.

У 1996—1997 гадах вучоныя апыталі 2936 жанчын ва ўзросце 45 гадоў. Тыя падзялілі, як часта займаюцца сексам. Часцей за ўсё адказ быў «раз на тыдзень», 64 % з іх адзначылі, што ў іх быў секс у апошнія сем дзён.

Далейшыя назіранні за гэтымі жанчынамі паказалі: на працягу наступных 10 гадоў у тых, хто займаўся сексам раз на тыдзень, верагоднасць наступлення менапаўзы была на 28 % ніжэйшая, чым у тых, хто ім наогул не займаўся. Тыя, у каго секс быў раз на месяц, сутыкаліся з менапаузай ва ўзросце да 52 гадоў на 19 % радзей за жанчын, якія не займаліся сексам.

***— Ці абавязкова жанчыне патрэбны секс, каб адчуваць сябе шчаслівай?***

— Добраахвотны секс станоўча ўплывае на псіхаэмацыянальны стан жанчыны. Калі запатрабаванне ў інтымных адносінах ад прыроды вялікае, адсутнасць сексуальнага жыцця будзе негатыўна адбівацца на эмацыянальным стане, змяншаючы такім чынам якасць жыцця жанчыны. Аднак аргазм, адчуты з партнёрам, не асаблiва адрозніваецца ад аргазму, зведанага самастойна, таму мастурбацыя — выхад з сітуацыі.

Што да карэляцыі частаты сексу з адчуваннем шчасця, у 2016 годзе даследчыкі з Ганконга, Сінгапура і ЗША апублікавалі вынікі апытанняў дарослага насельніцтва Злучаных Штатаў Амерыкі за 1988—2002 гады, праведзеных Нацыянальным цэнтрам грамадскай думкі пры Чыкагскім універсітэце. Усяго апрацавалі больш за 55 тысяч анкет.

Навукоўцаў цікавілі даныя аб тым, колькі партнёраў было ў чалавека за мінулы год і на працягу пяці гадоў. Аказалася, у 15,2 працэнта мужчын сексу не было год, у 8,7 працэнта — пяць гадоў. У жанчын — 26,3 і 17,4 працэнта адпаведна. Сярод удзельнікаў апытання былі і тыя, хто знаходзіцца ў шлюбе. Падобныя звесткі атрымалі ў іншых краінах: напрыклад, 24 працэнты шлюбных пар у Японіі ва ўзросце 20—59 гадоў ні разу за год, які прайшоў да апытання, не ўступалі ў сувязь.

Потым навукоўцы параўналі гэтыя вынікі з адказамі на пытанне аб шчасці. Як высветлілася, яны не карэлююць: тыя, хто доўгі час не меў інтымных адносін, шчаслівыя не менш, чым сексуальна актыўныя мужчыны і жанчыны. У папулярнай псіхалогіі заўсёды лічылі наадварот — працяглае ўстрыманне ў фізічна здаровага дарослага чалавека паказвае на эмацыянальнае няшчасце. Аўтары работы прыйшлі да высновы, што, магчыма, ёсць іншыя вымярэнні, якія значна больш уплываюць на душэўны стан, і сексуальная актыўнасць адыходзіць на другі план. Гаворка ідзе аб самадастатковасці, упэўненасці і прынцыпах у сябе, аб жыццёвых мэтах і асобасным росце. Вядома, усё гэта не выключае інтымных кантактаў.

***— У цэлым, ці небяспечнае ўстрыманне ў жанчын і яго наступствы?***

— Калі жанчына навучылася спраўляцца з сексуальным напружаннем, якое ўзнікае час ад часу, самастойна (з дапамогай мастурбацыі, фізічных практыкаванняў), не жадае разменьвацца на выпадковыя сувязі, не пачуваецца нешчаслівай у адзіноце, то ўрачы могуць хвалявацца за такую жанчыну не больш, чым за іншых.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

15 сакавіка 2023 г. № 9 (695)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


З НАГОДЫ

# ПРАЦЯГВАЦЬ ТРАДЫЦЫІ І ГАНАРЫЦЦА КРАІНАЙ

## Аб чым Наталля КАЧАНАВА гаварыла з юнымі беларусамі, уручаючы ім пашпарты










Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Галоўны дакумент з рук Старшыні Савета Рэспублікі атрымалі 20 маладых грамадзян нашай краіны. Урачыстая цырымонія ўручэння пашпартоў, якая адбылася ў рамках Усебеларускай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!», прысвечанай Дню Канстытуцыі, прайшла ў Савеце Рэспублікі.**

Як звярнула ўвагу спікер верхняй палаты парламента, нягледзячы на тое, што наша краіна мае глыбокія гістарычныя карані, яна дастаткова маладая. «Але нават за гэтыя гады мы сфарміравалі свае добрыя традыцыі, і адна з іх — напярэдадні і ў сам Дзень Канстытуцыі мы ўручаем пашпарты нашым хлопцам і дзяўчатам, якія прыязджаюць з розных рэгіёнаў краіны, — адзначыла Наталля Качанава. — Мы з вялікай радасцю прымаем удзел у гэтай выдатнай акцыі, для нас вялікі гонар уручыць вам пашпарт».

Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што ў Беларусі падрастаючаму пакаленню ўдзяляецца вялікая ўвага. Па яе словах, напэўна, няма ніводнай краіны, дзе б так клапаціліся аб моладзі. «Мы разумеем, што гэта будучыня нашай краіны, — заўважыла Наталля Качанава. — І тое, якой наша краіна будзе ў будучыні, залежыць ад вас — ад тых, хто сёння вучыцца ў навучальных установах: у школах, каледжах, ліцэях, ВНУ. І вельмі важна, каб вы, падрастаючы, сфарміравалі дакладнае ўяўленне аб тым, што наша краіна найлепшая. Яна сапраўды такая, і мы па праве ёй можам ганарыцца. Вы ведаеце, што Прэзідэнт нашай краіны шмат увагі аддае маладзёжнай палітыцы, развіццю маладзёжнага руху, заўсёды з вялікай радасцю прымае ўдзел у маладзёжных мерапрыемствах, сустракаецца з моладдзю».

Спікер запэўніла, што дзяржава і надалей усё будзе рабіць для таго, каб моладзі камфортна жылося на роднай зямлі. «А вы павінны разумець, што зусім хутка прыйдзе час, калі вы будзеце працягваць тыя слаўныя традыцыі, якія закладзены ў нашай краіне, — звярнулася Наталля Качанава да хлопцаў і дзяўчат. — І вельмі важна, каб, працягваючы гэтыя традыцыі, вы ганарыліся сваёй краінай. Вы — сапраўдныя патрыёты, ва ўсіх вас ужо ёсць дасягненні ў розных сферах. І ў мяне велізарная да вас просьба: звярніце ўвагу на тых, хто побач, каму патрэбна дапамога. Я ведаю, што, калі ў чалавека сур'ёзная грамадзянская пазіцыя, ён многае можа зрабіць для таго, каб дапамагчы таму, хто побач з ім мае ў гэтым патрэбу. Вы павінны быць усе разам, павінны быць адзіныя».

Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што ўжо год наша краіна жыве па абноўленай Канстытуцыі. «Беларусь — прававая дзяржава, таму для нас вельмі важна, каб рашэнні, якія прымаюцца, былі дакладна вывераныя і наша краіна развівалася, памнажала свае добрыя традыцыі, развівалася эканамічна, — падкрэсліла яна. — І ўсё гэта дзякуючы законам, якія дзейнічаюць у нашай краіне».

Наталля Качанава павіншавала маладых людзей з надыходзячым Днём Канстытуцыі, з атрыманнем пашпартоў. Пажадаўшы моладзі ўсяго самага добрага, яна адзначыла, што дзяржава вельмі разлічвае на тое, што падрастаючае пакаленне зробіць усё для таго, каб наша краіна была найлепшая, каб Беларусь развівалася і квітнела.

**Вераніка КАНЮТА.**

НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ

# Адзінства, салідарнасць, шматбаковае супрацоўніцтва

**Завяршаецца візіт намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Валерыя БЕЛЬСКАГА ў Манаму (Каралеўства Бахрэйн), дзе праходзіць 146-я Асамблея Міжпарламенцкага саюза (МПС). У Асамблеі бярэ ўдзел 117 парламентаў — усяго звыш тысячы чалавек.**

Выступаючы з дакладам «Роля парламентаў у падтрымцы нацыянальных і глабальных намаганняў па аднаўленні пасля пандэміі» на Другой канферэнцыі Парламенцкай сеткі Руху недалучэння, якая адбылася ў рамках Асамблеі, Валерый Бельскі адзначыў, што пандэмія каранавіруса і яе шматлікія наступствы працягваюць складаць сур'ёзную праблему для чалавецтва і патрабуюць глабальнага адказу, заснаванага на адзінстве, салідарнасці і шматбаковым супрацоўніцтве. У дадзеным кантэксце сенатар высока ацаніў ролю Руху недалучэння і старшынства Азербайджана ў мабілізацыі глабальных намаганняў па барацьбе з вірусам праз некалькі пасляховых ініцыятыў, якія атрымалі шырокае міжнароднае прызнанне і падтрымку.

Парламентарый акцэнтаваў увагу на тым, што з 1998 года Беларусь актыўна ўдзельнічае ва ўсіх мерапрыемствах Руху недалучэння і прыўносіць у яго дзейнасць прыкметную дабаўленую вартасць. Наша краіна, па яго словах, праводзіць міралюбівую знешнюю палітыку, паслядоўна выступае за ўмацаванне даверу і плённага супрацоўніцтва. Валерый Бельскі звярнуў увагу ўдзельнікаў канферэнцыі на найважнейшую ініцыятыву Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі аб глабальным дыялогу ў мэтах фарміравання новай і ўсёабдымнай сістэмы калектыўнай бяспекі і заклікаў дзяржавы Руху недалучэння актыўна падтрымаць яе.



Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі адзначыў: пандэмія паказала, што здольная тармазіць глабальныя палітычныя працэсы і правакаваць новыя крызісы. «Мы бачым, як з прычыны пандэміі сістэме міжнароднай бяспекі зноў кідаюць выклік канфрантацыйныя падыходы ваенна-палітычных блокаў дзяржаў, — дадаў ён. — Неправамерна разбураецца архітэктура міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі, дамінуе палітыка сілы і агрэсіі, адкрытага ўмяшання ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў. У святле гэтых выклікаў і пагроз гістарычна жыццёва важна ўмацаваць і павысіць эфектыўнасць Руху недалучэння. На фоне станаўлення шматпалярнага светаўладкавання Рух, які аб'ядноўвае 120 дзяржаў, у тым ліку тыя цэнтры сусветнай эканомікі, што найбольш актыўна развіваюцца, набывае асаблівую значнасць».

Акрамя таго, на пляцоўках Асамблеі Валерый Бельскі ўзяў удзел у каардынацыйнай сустрэчы кіраўнікоў парламенцкіх дэлегацый дзяржаў — членаў АДКБ у Міжпарламенцкім саюзе, выступіў у ходзе пасяджэння Пастаяннага камітэта МПС па справах міру і міжнароднай бяспекі, семінара па падрыхтоўцы Саміта будучыні ААН, паўдзельнічаў у пасяджэнні геапалітычнай групы «Еўразія» МПС, правёў шэраг двухбаковых сустрэч.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «Трэба толькі адказна ставіцца да сваёй справы, якой займаешся, і, несумненна, поспех у цябе будзе»

**Перадача «Скажинемолчи», што выходзіць на канале «Беларусь 1», ужо мае сваіх сталых прыхільнікаў. Для іх, а таксама для астатніх гледачоў, што ўключылі тэлевізар у святочны дзень, несумненна, было прыемным сюрпрызам прысутнасць у якасці галоўнай гераіні Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай. Яе дыялог з вядучымі быў цікавы і змястоўны. Асабліва знакавыя выказванні Наталлі Іванаўны мы сабралі ў гэтай публікацыі.**

## Аб умяшанні ва ўнутраныя справы Беларусі і санкцыях

«Гэта неправамерна, незаслужана, і такога быць не павінна, каб нехта ўмешваўся ва ўнутраныя справы тваёй краіны. Гэта проста недапушчальна. І нас жа не хочуць чуць тыя, хто не хоча чуць. А мы супрацоўнічаем з тымі краінамі, якія сёння гатовыя канструктыўна вырашаць разам з намі тыя задачы, што стаяць перад кожнай краінай паасобку ўзятай і перад нашым народам, — сказала Наталля Качанава. — Вядома, санкцыі — гэта дрэнна. І самая бяда ў тым, што гэтыя людзі, якія з'ехалі з нашай краіны, і заклікаюць да санкцый у дачыненні да тваёй краіны. Каму ад гэтага горш? Нашым людзям, бо пакутуе ад гэтага народ, пакутуюць людзі. А для чаго гэта робіцца? Гэта ваша такая любоў да сваёй краіны? Гэта ваша такая любоў да свайго народа? Гэта проста несумленнае зараблянне грошай на чужыне».

Разам з тым, дзякуючы выверанай палітыцы Прэзідэнта, беларусы не адчулі на сабе негатыўнае ўздзеянне санкцый. «Мы бачым, як актыўна кіраўнік дзяржавы працуе над тым, каб шукаць нашы кропкі ўзаемадзеяння з іншымі краінамі. І людзі сапраўды на сабе гэтых санкцый не адчулі, калі гаварыць па вялікім рахунку, — адзначыла спікер. — Вядома, недзе парушыліся лагістычныя ланцужкі, даводзіцца больш працаваць сёння па імпартазамяшчэнні. Але гэта задача не сённяшняга дня. Яна была пастаўлена даўным-даўно — працаваць па імпартазамяшчэнні і рабіць усё, каб у нас было ўсё сваё».

«А санкцыі... На жаль, такое ёсць сёння, і няхай гэта будзе на сумленні тых, хто прымае такія рашэнні і хто ініцыіруе іх у адносінах да нашай краіны», — падкрэсліла Наталля Качанава.

## Аб адносінах да кіраўніка дзяржавы

Вядучыя ўспомнілі фразу Наталлі Качанавай, якую яна ўжо агучвала: «Я з Прэзідэнтам буду да канца сваіх дзён». Журналісты пацікавіліся, што захапляе яе ў Прэзідэнце.

«Я заўсёды разумела і шанавала працу нашага кіраўніка. Ды гэта нават не праца — гэта жыццё. Гэта тое, чым жыве чалавек на працягу гэтых гадоў, ствараючы краіну па драбніцах. Але калі я стала зусім побач, убачыла, наколькі гэты чалавек адданы свайму народу, сваёй краіне, наколькі ён любіць кожнага беларуса. Гэта праўда. Я ўбачыла і зразумела, што толькі з гэтым Прэзідэнтам можа быць будучыня ў нашай краіны, — сказала Наталля Качанава. — Прэзідэнт нам гаварыў яшчэ ў 2019 годзе, што ідзе геапалітычны раздзел свету. І мы цяпер рэальна гэта ўбачылі».

Паводле яе слоў, толькі такі мудры і дасведчаны палітык можа кіраваць краінай. «Гэта, напэўна, нашай шматпакутнай Беларусі Бог паслаў такога Прэзідэнта, які па-сапраўднаму шануе свой народ, сваю краіну і робіць заўсёды ўсё на карысць народа, — адзначыла спікер. — І таму я дакладна ведала, што ніколі не збочу з гэтага шляху. І калі я патрэбна буду як кіраўнік або проста як чалавек, які сваёй жыццёвай пазіцыяй можа аказваць падтрымку нашай краіне, нашай дзяржаве, нашаму Прэзідэнту, я буду заўсёды побач».

## Аб сакрэце паспяховай кар'еры

Вядучыя пацікавіліся ў спікера, ці працуе ў Беларусі сацыяльны ліфт і ці можа дасягнуць поспеху любы, хто не лянуецца працаваць.

«Я шмат пра гэта думала і часта кажу, што гэта так. Трэба толькі адказна ставіцца да сваёй справы, якой займаешся, і, несумненна, поспех у цябе будзе, — адзначыла Наталля Качанава. — Вы ведаеце, я ніколі, уласна кажучы, не думала пра кар'еру. Мне заўсёды было камфортна працаваць там, дзе я працавала. Але так склалася, што на нейкім этапе цябе заўважалі, прапаноўвалі новыя прыступкі тваёй росту. Я вельмі не люблю, калі мяне ўгаворваюць, таму імкнулася прымаць гэтыя рашэнні, хоць яны мне заўсёды даваліся вельмі няпроста. Неяк не было ў маім жыцці таго, каб я хацела зрабіць нейкую кар'еру. Мне здавалася, што трэба выконваць сумленна і адказна сваю справу, якой ты займаешся. Я ўпэўнена, любы чалавек, які па-сапраўднаму ставіцца да сваіх абавязкаў, які жадае зрабіць нешта добрае для сваёй краіны, для людзей (гэта абсалютна не высакапарныя словы), які любіць людзей, можа дасягнуць у нашай краіне ўсяго таго, пра што марыць. І нават калі не марыць, але вельмі адказна займаецца сваёй справай, можа для сябе вырашыць вельмі важныя пытанні ў кар'ерным росце».

Спікер прызналася, што вырасла ў простай сям'і. «У мяне мама і тата рабочыя. Я вельмі люблю сваю сям'ю, і мы вельмі дружныя насамрэч. Мама заўсёды казала так нам усім (нас трое ў сям'і): калі табе людзі робяць дрэнна — заўсёды ім рабі добра. І ніколі не бяры чужога. Гэта была ў нас такая навука ад бацькоў», — распавяла Старшыня Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава ўпэўнена: калі ёсць унутраны стрыжань — цябе не збіць з правільнага шляху. «Мяне збіць са шляху складана, асабліва тады, калі бачу, што гэта несправядліва, несумленна, няправільна. Я вельмі жорстка адстойваю свой пункт гледжання і сваю пазіцыю», — канстатавала спікер.

## Аб спецыфіцы асабістых прыёмаў

«Калі людзі прыходзяць на асабістыя прыёмы, вядома, трэба набрацца цярпення і выслухаць чалавека. Гэта добрая форма зносін з народам. І наша краіна можа гэтым ганарыцца. У нас ёсць закон аб зваротах грамадзян. І дзе б ты ні працаваў, на якой пасадзе, пачынаючы ад кіраўніка прадпрыемства, ты павінен, ты абавязаны працаваць з людзьмі, выслухоўваючы іх прапановы, думкі, скаргі, пажаданні... А цяпер, калі я ў рангу Старшыні Савета Рэспублікі, члены Савета Рэспублікі па законе павінны раз у месяц праводзіць прыёмы па асабістых пытаннях. Мы абавязаны гэта рабіць», — сказала Наталля Качанава.

Асабістыя прыёмы грамадзян Наталляй Качанавай, як правіла, доўжацца да позняга вечара. Апошні працягнуўся 12 гадзін. «Вядома, калі мы аб'яўляем прыём па асабістых пытаннях, запісваецца дастаткова шмат людзей. Яны прыходзяць з тымі пытаннямі, што іх хвалююць. Так, ёсць такія, з якімі яны звярталіся ўжо ў розныя інстанцыі, і дапамога не была аказана. Але ў большай ступені гэта судовыя рашэнні, дзе ўжо складана дапамагчы чымсьці. Хоць мы спрабуем з Генеральнай пракуратурай, Вярхоўным судом яшчэ раз паглядзець гэтую справу, — адзначыла спікер. — Часам з кімсьці даводзіцца сустракацца неадночы. Ёсць такія выпадкі. Яшчэ раз паўтаруся: мы, улада, не павінны ў такіх пытаннях паказваць сваю некампетэнтнасць або нежаданне працаваць. Гэтак жа працуюць мае калегі, прымаючы людзей, сустракаючыся з імі. У гэтым няма нічога асаблівага».

НАШЫ ЛЮДЗІ

# ЖАНОЧЫЯ РУКІ — ПЯШЧОТА І СІЛА

**У Тулаўскім сельскім Савеце Віцебскага раёна ўшанавалі жанчын, якія аддалі звыш 30 гадоў працы ў галіне сельскай гаспадаркі. Сярод іх — даяркі, паляводы і нават трактарысткі.**

У сонечныя вясновыя дні ўсе прадстаўніцы прыгожага полу акружаны ўвагай і пяшчотай незалежна ад даты ў календары. Расцвітае прырода, дорачы пагодныя хвіліны, а разам з ёю расцвітаюць, як кветкі, жанчыны. Розныя па ўзросце і пасадах, аднолькавыя па дälікатнасці і ўнутранай сіле — цяпер былыя працаўніцы эксперыментальнай базы «Тулава» знаходзяцца на заслужаным адпачынку. Адным сакавіцкім днём яны сабраліся разам, каб успомніць дасягненні свайго калектыву. «Вечар сустрэчы» работніц сельскай гаспадаркі прайшоў у Тулаўскім сельскім Савеце пад эгідай прафсаюзнага лідара аграрыяў Віцебскага раёна Таццяны Дзіканавай.

Дзесяць жанчын, якія ўнеслі важкі ўклад у станаўленне і роскві́т эксперыментальнай базы, са слязамі радасці ўспаміналі сваю маладосць, сяброўак-калег і дзякавалі адна адной за дапамогу і падтрымку.

Больш за 50 гадоў стажу мае ў сваім працоўным летапісе Ларыса Дзмітрыеўна Ларывонава — летам вазіла механізатарам гарачыя абеды, пасля «стаяла на вагах»: была загадчыцай склада. На долю 84-гадовай жанчыны выпала шмат выпрабаванняў: канцлагер «5-ы полк», затым — берлінскі «Норд», пасляваеннае галоднае дзяцінства. Але і сёння, нягледзячы на звілістыя жыццёвы шлях, у яе вачах не згасаюць агеньчыкі.

Жанна Пятроўна Торчык — заслужаная даярка «Тулава» — прыйшла на ферму ў 1985 годзе. Тады, расказвае жанчына, працаваць ў яе прафесію было вельмі цяжка: два гады запар ездзіла з горада ў вёску на работу, а калі даенне зацягвалася — хадзіла пешшу.




І гэта прытым, што дома двое дзяцей. Дагэтуль Жанна Пятроўна ўспамінае адну са сваіх рагатых любімец — карову Карамельку, якая любіла цукеркі з кішэні гаспадыні. Надзея Віктараўна Сафонава пацвярджае, што прафесія даяркі была пачэснай: тады за высокія надоі жанчыны атрымлівалі па 300 рублёў, калі бухгалтар зарабляў 80. Адзін з прыемных успамінаў пра падзяку за працу на ўзроўні вобласці — паездка ў Чэхаславакію. Пуцёўку Надзея Віктараўна беражліва захоўвае дагэтуль.

У 1980-х гадах сярод 70 мужчын-механізатараў у эксперыментальнай базе «Тулава» працавалі дзве дзяўчыны. Валянціна Уладзіміраўна Чарназёмава 30 гадоў сядзела за стырном «Беларуса»: яна маладая, поўная авантурызму, арала, сеяла, капала бульбу, ужываючы розныя агрэгаты, і вельмі чакала вясну, каб зноў выйсці ў поле. «Я вельмі ганарылася, што кірую трактарам. І няхай ад мяне, маладой, пахла саляркай, не было часу надзець новую сукенку — мы працавалі аддана, не гледзячы на гадзіннік», — успамінае жанчына.

Дваццаць гадоў трактарнага стажу і ў старэйшай калегі Валянціны — Зоі Іванаўны Логінавай. Яна два разы прадстаўляла Віцебшчыну на рэспубліканскіх спаборніцтвах сярод трактарыстак, напамінам аб былых працоўных вышынях для жанчыны з'яўляюцца Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга і медаль «За працоўную доблесць». Надзейныя сяброўкі па жыцці і прафесіі Валянціна і Зоя нават атрымлівалі ад Прэзідэнта чырвоныя МТЗ-82 і мікрахвалеўкі. Адначасова яны трымалі вялікія асабістыя гаспадаркі і расцілі па двое дзяцей. Вось яны — нязломныя гераіні палёў!

«Вы сваёй працай заклалі моцны падмурак сельскагаспадарчай галіны нашай краіны, сфарміравалі моцныя аграрныя традыцыі, грунтуючыся на якіх, сёння мы крочым у надзейную будучыню. Шчыры дзякуй вам, паважаныя ветэраны, за адданасць сваёй справе», — павіншавала жанчын Таццяна Дзіканава і ўручыла падарункі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

ПРАЕКТЫ МАЛЕНЬКАГА ГАРАДКА

# Дворык, дзе ўтульна ўсім

## Старшыня Горацкага райсавета пра тое, як у райцэнтры рэалізоўваецца праект па добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый

**Сёлета канцэпцыя выбару дваровых тэрыторый для ўключэння іх у план па добраўпарадкаванні ў вобласці змянілася. І дэпутаты пры гэтым выконваюць цяпер не апошнюю ролю. У той час, калі адпаведныя службы выканкама ацэньваюць агульны стан пляцовак, дэпутаты высвятляюць гатоўнасць удзелу жыхароў у працэсе абнаўлення. З улікам іх меркаванняў і фарміруецца канчатковы варыянт.**



У Горках у гэты спіс трапілі чатыры двары. **Старшыня Горацкага райсавета Максім ПАТАПЕНКА** дэманструе папку фармату А4 з падрабязным апісаннем канцэпцыі пераўтварэння тэрыторый. Улічана ўсё: колькасць дамоў, якія трапляюць у зону карыстання дваровай пляцоўкай, насельніцтва, якое там пражывае, у асобнай графе пазначана колькасць дзяцей з указаннем іх узросту. Зроблены падрабязны пералік абсталявання, якое там знаходзіцца. Распісана, дзе што плануецца замяніць, колькі каштуе новае абсталяванне, дзе яго плануецца набыць. Прыкладзены каштарыс, што і за кошт чаго будзе рабіцца.

Частку спартыўна-гульнявых комплексаў устанавяць у рамках капітальнага рамонту дамоў. Узяць, напрыклад, дом № 24 на праспекце Інтэрнацыянальны, дзе плануецца такі рамонт. У табліцы пазначана, што ў ім і ў чатырох суседніх дамах жыве болей чым 100 дзяцей, якія змогуць карыстацца агульнай дваровай пляцоўкай. Прыкладаецца схема, дзе размесціцца спартыўнае і гульнявое абсталяванне, іншыя элементы добраўпарадкавання. Аналагічныя планы распрацаваны па ўсіх астатніх тэрыторыях. Сучасная спартыўна-гульнявая пляцоўка з'явіцца і ў двары комплексу шматпавярховікаў па вуліцы Калініна, дзе цяпер ідзе капрамонт аднаго з дамоў. Хутка разгорнуцца работы па вуліцы Будаўнікоў у раёне дамоў № 1 і 3. У планах — завяршыць добраўпарадкаванне ўсіх чатырох дваровых тэрыторый да 1 верасня. На гэта з бюджэту выдзяляецца 200 тысяч рублёў.

— Місія народных абраннікаў — увесь час быць на сувязі з насельніцтвам і ўзгадняць ход супрацоўніцтва, — удакладняе суразмоўнік. — Праводзім сходы, абмяркоўваем план сумесных дзеянняў. Пазіцыя тых, хто лічыць, што ўсё павінна рабіцца за кошт дзяржавы, няправільная. Гэта ўтрыманскае меркаванне, жаданне перакласці свае абавязкі на плечы іншых. Хто, як не тыя, хто жывуць у двары канкрэтнага дома, здольныя зрабіць яго ўтульным і прыгожым? Гэта прыклад для іх дзяцей, якія будуць гуляць у гэтым двары, займацца спортам. Дзяржава выдзяляе сродкі на абсталяванне, але толькі ад людзей залежыць, як доўга яму функцыянаваць. І чым больш яны будуць зацікаўлены ў супрацоўніцтве, тым лепшы атрымаецца вынік. Ёсць прыклады, калі жыхары ўдзельнічалі рублём і напаўнялі свой дворык дадатковым абсталяваннем. Ну а перакапаць газон, пасадзіць дрэва, кветкі — гэта ўжо ў сілах кожнага.

Старшыня райсавета звяртае ўвагу на тое, што сёння актыўнасць жыхароў вітаецца як ніколі. У раёне хапае прыкладаў, калі людзі самі праяўляюць ініцыятыву і гэта знаходзіць фінансавую падтрымку. Летась па лініі Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў было выдзелена 4360 рублёў на матэрыялізацыю ідэі жыхароў з аграгарадка Рэкта. Цяпер там цудоўная дзіцячая пляцоўка, зробленая на ўмовах долевага ўдзелу. Сяльчане стварылі цікавыя элементы добраўпарадкавання, зварылі вароты для спартыўнай пляцоўкі. Райсавет спрабуе атрымаць фінансавую дапамогу на добраўпарадкаванне паркавай зоны каля возера ў аграгарадку Леніна. На гэтыя мэты неабходна 90 тысяч рублёў. Мясцовыя жыхары мараць зрабіць там гульнявы і спартыўны комплексы, паставіць альтанкі, добраўпарадкаваць пешаходныя дарожкі.

— Такія ініцыятывы трэба падтрымліваць, — лічыць Максім Патапенка. — На жаль, дэпутаты не маюць магчымасці дапамагчы матэрыяльна. Вялікія спадзяванні ўскладаем на новы Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні». У яго праекце ёсць вельмі важная навацыя — агаворваецца магчымасць фінансавання грамадскіх ініцыятыў за кошт бюджэтаў рэспубліканскага, абласнога, раённага і іншых крыніц, у тым ліку з удзелам насельніцтва. Калі раней мы працавалі з Банкам рэканструкцыі і развіцця, то цяпер дапамога будзе фарміравацца іншым чынам. І гэты варыянт адкрывае большыя перспектывы. З такім падыходам лягчэй заахвоціць людзей удзельнічаць у навядзенні парадку на зямлі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**
*г. Горкі.*

САЦЫЯЛЬНЫ АСПЕКТ

# Пабудуем — будзем жыць

## У населеных пунктах Пінскага раёна актыўна вядзецца жыллёвае будаўніцтва

**Сёлета ў Пінскім раёне плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 21,5 тысячы квадратных метраў жылля. Для забеспячэння грамадзян, якія маюць жаданне пабудаваць дамы ў сельскай мясцовасці, распрацоўваюцца праекты на кварталы індывідуальнай забудовы ў аграгарадках. Адначасова працягваецца ўзвядзенне шматкватэрных дамоў.**

Паводле інфармацыі **начальніка аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Пінскага райвыканкама Юрыя БУШЫКА,** першы шматкватэрны квартал узводзяць у прыгараднай вёсцы Галева на тэрыторыі, якая знаходзілася ў землях запасу Аснежыцкага сельсавета. Можна сказаць, што зямля чакала свайго часу і дачакалася: амаль год таму ўведзены ў эксплуатацыю першы дом з новага квартала пад назвай «Вясновы». Гэта дзесяціпавярховік, які складзены з блок-секцый буйнапанэльнага домабудавання з унутранай аддзелкай. Дом абсталяваны пасажырскімі ліфтамі, адпавядае ўмовам безбар'ернага асяроддзя. У ім 90 кватэр агульнай плошчай больш за 6 тысяч квадратных метраў. Будаўніцтва вялі спецыялісты прадпрыемства «Брэстжылбуд». Яны ж узвялі і два наступныя дамы квартала — сямі- і дзесяціпавярховыя. Паводле плана, у квартале «Вясновы» з часам узвядуць яшчэ два дамы. Усяго тут будуць жыць каля 360 сем'яў.

Паралельна вядзецца ўладкаванне транспартных і пешаходных камунікацый, дзіцячых і спартыўных пляцовак, стаянак і велапаркоўак. Прадугледжаны гаспадарчыя пляцоўкі, месцы для выгулу сабак. Прастора спраектавана так, каб двары заставаліся свабоднымі ад транспарту. А комплекснае азеляненне, іншыя элементы інфраструктуры зробяць жыццё максімальна камфортным. Да несумненных пераваг можна аднесці і блізкасць да горада.

Квартал у Галеве — не адзінкавы прыклад такіх падыходаў. У раёне маюць намер працягваць шматпавярховае будаўніцтва. У аграгарадку Аснежыцы зарэзервавалі месца для будаўніцтва трох сяміпавярховых дамоў. Акрэслены падыход прадыктаваны дэфіцытам зямельных участкаў для індывідуальнага будаўніцтва, бо названыя населеныя пункты размешчаны ў прыгарадзе.



Вуліца ў Плешчыцах.

А вось у тых вёсках і аграгарадках, дзе плошчы дазваляюць, ідзе работа па будаўніцтве інжынерна-транспартнай інфраструктуры ў кварталах індывідуальнай забудовы. Ужо летась узведзены інжынерныя сеткі і вуліцы з гравійным пакрыццём у новым квартале на 104 участкі ў вёсцы Жабчыцы, у населеных пунктах Парахонск, Гарнова, Пасянічы, Чарнеевічы.



Праект квартала індывідуальнай забудовы ў Плешчыцах.

**Кіраўнік спраў Малоткавіцкага сельскага Савета Алена ПРЫХОДЗЬКА** сказала, што ў Жабчыцах дарогі, лініі электразабеспячэння, іншыя камунікацыі фактычна гатовыя да будучай забудовы на новым месцы:

— Зараз ідуць апошнія прыгатаванні, узгадненні дакументацыі. Разлічваем, што недзе праз месяц пачнецца размеркаванне ўчасткаў. З іх 30 будуць рэалізаваны праз аўкцыён, а 74 выдзелены сем'ям тых, хто мае патрэбу і стаіць у чарзе. Ахвотных многа, у спісе чаргавікоў па сельсавеце зараз 218 сем'яў, з іх — сем шматдзетных. Яны, як вядома, ідуць па-за чаргой. Таму пры жаданні — атрымаюць участкі ў новым квартале. Астатнія будуць размеркаваны ў звычайным парадку.

У вёсцы нядрэнная інфраструктура, ёсць газ. Мясціна, дзе распрацаваны квартал, прыгожая, размешчана на грудку, думаю, патэнцыяльныя навасёлы будуць задаволеныя, — заўважыла Алена Мікалаеўна.

Зусім нядаўна скончаны работы па праектаванні квартала жылой забудовы ў аграгарадку Плешчыцы. Квартал разлічаны на 46 участкаў. Падрыхтоўка да яго асваення пачнецца з рэканструкцыі водазабору. У выніку магутнасць апошняга будзе павялічана, на гэтую работу выдзелена 2,2 мільёна рублёў.

Як паведаміла карэспандэнту МС **старшыня Плешчыцкага сельвыканкама Віялета ПАДЛУЖНАЯ,** у аграгарадку пражывае каля 1100 чалавек, усяго па сельсавеце колькасць насельніцтва крыху перавышае лічбу 2790. На ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў стаяць 117 чалавек:

— Для іх, чаргавікоў, участкі будуць выдзяляцца на льготных умовах, іншыя ахвотныя змогуць набываць пляцы на аўкцыёне. Пакуль яшчэ зямлю на ўчастку ніхто не дзяліў, бо няма прадугледжаных заканадаўствам камунікацый, а новы квартал існуе толькі ў папяровым ды электронным варыянтах. Але рашэнне прынятае, і мы чакаем, што работа распачнецца сёлета.

У Пінскім раёне ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў стаяць каля 1700 чалавек, у тым ліку 484 маладыя сям'і і 360 шматдзетных. Многія з іх неўзабаве змогуць адсвяткаваць наваселле ў новых шматкватэрных ды сядзібных дамах.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з тэлеграм-канала Пінскага райвыканкама.**

# НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ АДНОВЯЦЬ ІМПЕРАТАРСКІ МАРШРУТ

## Як органы дзяржаўнай улады імкнуцца падтрымліваць ініцыятывы па развіцці турызму

**Выпрацаваць якасны турыстычны прадукт, цікавы розным катэгорыям турыстаў, у тым ліку замежным, — такую задачу паставілі перад сабой удзельнікі праекта «Дарогамі Кацярыны». Яго ідэя — стварэнне комплекснага міжнароднага маршруту з акцэнтам на рэальныя факты, звязаныя з імператрыцай Кацярынай II. Праект прэзентавалі на штогадовай дзелавой сустрэчы «Садружнасць-2023» у Бранску.**



Падчас падпісання пагаднення аб супрацоўніцтве рэгіянальны прадстаўнік Агульнанацыянальнага саюза індустрыі гасціннасці ў Бранскай вобласці Галіна ГАЛАКЦІЁНАВА, намеснік старшыні Кармянскага райвыканкама Наталля СІДАРАВА і старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА.

### Інвестыцыі ў гісторыю

У прыгранічных рэгіёнаў Беларусі і Расіі ёсць усе ўмовы для фарміравання і развіцця турызму як прыярытэтнага напрамку трансгранічнага супрацоўніцтва. Гаворка не толькі аб адкрыцці новых аб'ектаў для адпачынку і аздараўлення, але і аб магчымасці ўмацавання культурна-гістарычных сувязяў паміж беларуска-расійскімі рэгіёнамі. На важнасць паглыблення гэтага кірунку супрацоўніцтва звярнула ўвагу кіраўніцтва саюза «Гандлёва-прамысловая палата Бранскай вобласці». На сустрэчы дадатковае пагадненне аб супрацоўніцтве падпісалі Гомельскі і Кармянскі раённыя Саветы дэпутатаў Гомельшчыны і Гандлёва-прамысловыя палаты Бранска і Смаленска. Гэта стала важкім крокам на шляху ажыццяўлення ўнікальнага ў сваім родзе міжнароднага праекта «Дарогамі Кацярыны». Яго на сустрэчы дзелавых колаў у Бранску прадставіла аўтар ідэі **дырэктар установы «Тэрыторыя развіцця — XXI стагоддзе» Ірына БАГДАНЕЦ.** Па яе словах, ідэя стварэння новых турыстычных аб'ектаў узнікла на аснове легенд і гістарычных фактаў аб падарожжы імператрыцы Кацярыны II па тэрыторыі Гомельскага і Кармянскага раёнаў. Менавіта гэтыя два рэгіёны ў межах рэалізацыі праекта «Дарогамі Кацярыны» летась першымі падпісалі Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Кармянскім і Гомельскім раённымі Саветамі дэпутатаў.

— Міжрэгіянальнае ўзаемадзеянне ўдзельнікаў праекта дасць магчымасць унесці вялікі ўклад у развіццё тэрыторый і рэгіянальнага турызму, захаваць гісторыка-культурную спадчыну, бо «Дарогі Кацярыны» — гэта не толькі геаграфія маршрутаў, але і новы погляд на тое, што засталося нам у спадчыну ад гісторыі і вялікіх людзей, — запэўніла Ірына Багданец.

Дарэчы, менавіта з Ірынай Іванаўнай летась на Гомельшчыне змаглі бліжэй пазнаёміцца і пераняць вопыт дзейнасці ўдзельнікі семінараў-трэнінгаў па асновах праектнага менеджменту. Унікальны для паўднёва-ўсходняга рэгіёна маштабны навучальны курс быў арганізаваны Гомельскай абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў. Навучанне прайшлі звыш сарака прадстаўнікоў раёнаў, сярод якіх супрацоўнікі сельвыканкамаў, устаноў культуры, адукацыі, спорту і турызму, тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Брaлі ўдзел у семінарах-трэнінгах у тым ліку сем кіраўнікоў ініцыятыўных груп.

### Ёсць яшчэ і «Містычнае прыгранічча»

Між тым падпісанае пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Кармянскім і Гомельскім раённымі Саветамі дэпутатаў у сферы турызму і рэалізацыі адзінага праекта «Дарогамі Кацярыны»



Праект «Дарогамі Кацярыны» ў Бранску прадставіла аўтар ідэі — жыхарка Гомельскага раёна, дырэктар установы «Тэрыторыя развіцця — XXI стагоддзе» Ірына БАГДАНЕЦ.

падштурхнула да пашырэння ініцыятывы і стварэння агульнага міжнароднага турыстычнага прадукту «Кацярынінскі шлях». Цяпер ён актыўна развіваецца і пашыраецца дадатковымі маладзёжнымі праектамі. Так, у працяг ідэі вучань Грабаўскага дзіцячага садка — сярэдняй школы Гомельскага раёна Арцём Ганчарэнка прапанаваў уласны праект «Ад памяці — да гісторыі, ад гісторыі — да памяці» — распрацоўка прадстаўлена на конкурсе «100 ідэй для Беларусі». Малады чалавек разам з настаўнікамі і навучэнцамі распрацаваў турыстычны маршрут па славутасцях малой радзімы. Грабаўка вядома ўнікальным культурна-гістарычным багажом, яна так і прасіцца заняць сваю нішу ў турыстычнай індустрыі, пераканаsuccessful школьнік. Па яго задуме знаёмства з гісторыяй фамільнага роду Фашчаў, якому належала Грабаўка з XVIII да пачатку XX стагоддзя, адбываецца праз тэатралізаваную пастаноўку. У планах таксама — стварыць інтэрактыўную карту, на якой будуць пазначаны ўсе мясцовыя славутасці. Ні больш ні менш, але праект школьніка вырашана ўключыць у маштабны міжнародны турыстычны маршрут «Дарогамі Кацярыны». У рамках гэтага ж праекта на тэрыторыях Маркавіцкага і Грабаўскага сельсаветаў з'явіцца новы турыстычны маршрут «Містычнае прыгранічча». Аналагічная праца ахопіць і гістарычныя месцы Кармяншчыны, і далей па маршруце ў Бранскай і Смаленскай абласцях Расійскай Федэрацыі.

### Настальгія і развіццё

Стварэнне ўмоў для развіцця рэгіянальнага турыстычнага патэнцыялу праз узаемадзеянне органаў мясцовага самакіравання — на такі важны кірунак дзейнасці звяртае ўвагу **старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА,** якая таксама з'яўляецца старшынёй Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

— Важная ўмова рэалізацыі на практыцы мер па развіцці турыстычнага комплексу ў Гомельскім раёне — пастаянная ўвага да гэтага кірунку органаў дзяржаўнай улады ўсіх узроўняў — і першасная, і базавага. Гомельскі раённы Савет дэпутатаў і Гомельскі райвыканкам як органы ўлады зацікаўлены ў развіцці праектаў і ініцыятыў у галіне турызму, якія накіраваны на падтрымку сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна праз рост аб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў сферы турызму, стварэнне новых працоўных месцаў, развіццё новых напрамкаў турыстычнага бізнесу, а таксама ўцягванне прыродных і сельскіх тэрыторый у эканоміку раёна, — падкрэсліла дэпутат.

На яе думку, у раёне адзначаецца пакуль невысокая актыўнасць насельніцтва ў выбары менавіта гэтага кірунку прадпрымальніцтва. Пры тым, што ёсць і вельмі значныя, а галоўнае, перспектыўныя прыклады ў сферы турызму.

— Адзін з важных напрамкаў у гэтай справе — падтрымка ініцыятыў грамадзян, іх мабілізацыя на вырашэнне задач, якія не патрабуюць вялікіх бюджэтных сродкаў або прыцягнення адміністрацыйнага рэсурсу. У раёне ёсць прыклады грамадзянскай актыўнасці жыхароў, дэпутацкага корпуса.

